24 БЕЛАРУСЬ
ШТО І КАМУ ПАКАЗВАЕ ТЭЛЕКАНАЛ 8

ДРАНІКІ ДЛЯ ДАМ І РЫЦАРАЎ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 ЖНІЎНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 151 (30285)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЯФІМАЎ, міністр прамысловасці:

«Холдынгі Міністэрства прамысловасці павінны ў найкароткія тэрміны актуалізаваць свае экспартныя стратэгіі. Дасягненне эканамічнага суверэнітэту Беларусі, павышэнне яе ўстойлівасці перад знешнімі выклікамі ў многім залежыць ад правядзення ўзважанай знешнегандлёвай палітыкі. Найважнейшай крыніцай эканамічнага росту быў і застаецца экспарт. Таму абноўленыя стратэгіі павінны быць рэальна працуючым механізмам з актуальным планам канкрэтных дзеянняў. Патэнцыял у холдынгаў для гэтага ёсць».

ДАПАМОГА ПРЫЙДЗЕ ХУТКА

Фельчар выязной брыгады інтэнсіўнай тэрапіі падстанцыі № 7 Мінскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Лілія ЛЯГЕНЧАНКА на выклікі па нумары 103 выязджае ўжо трыццаць гадоў. Работу на «хуткай» наўрад ці хто назаве лёгкай. Аднойчы, прызнаецца яна, нават рашыла памяняць прафесію: адвучылася ў БДУ і магла выкладаць у школе біялогію. Але ўрэшце засталася на сваім месцы, бо пакліканне і здольнасць ратаваць здароўе, а нярэдка і жыццё людзей, даецца не кожнаму.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

КАРАТКА

• Мінская вобласць застаецца лідарам жніва 2024 года: аграрыі цэнтральнага рэгіёна намалацілі больш як 1,6 млн т збожжа з улікам рапсу.

• **У медустановы Мінскай вобласці прыходзяць на працу больш за 770 урачоў і спецыялістаў сярэдняга медперсаналу.**

• Беларусь з пачатку года наведалі без віз амаль 132 тысячы жыхароў ЕС.

• **Міністэрства лясной гаспадаркі распрацуе праграму па лесааднаўленні ветравальна-бураломных участкаў.**

• Наведванне лясоў абмежавана ва ўсіх раёнах Брэсцкай, Мінскай і Магілёўскай абласцей.

ISSN 1990 — 763X

Актуальна

ТРЫ Ў АДНЫМ

Падатковыя інспекцыі пачалі накіроўваць паведамленні аб аплаце маёмаснага плацяжу

Начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ параіў уладальнікам маёмасці правяраць паштовыя скрыні, бо, калі ў вас ёсць нерухомасць, участак зямлі або аўтамашына, прыйшоў час плаціць падаткі. У гэтым годзе іх упершыню аб'ядналі ў адзіны маёмасны плацеж. Паведамленні адправяць па пошце, а тыя, у каго ёсць асабісты кабінет на сайце МПЗ, атрымаюць таксама (дадаткова) электронную версію.

СТАР. 7

Сезонны клопат

ШКОЛЫ ЧАКАЮЦЬ ВУЧНЯЎ

Падрыхтоўка да новага навучальнага года ва ўстановах адукацыі Мінска і вобласці завяршаецца

Другога верасня па ўсёй краіне свае дзверы для дзяцей гасцінна расчыняць школы. У Мінску ўстановы адукацыі прымуць адных толькі першакласнікаў 22 тысячы! У Мінскай вобласці нашых юных грамадзян сустрэнуць 1024 установы адукацыі. Навучальны працэс пачнецца ў 24 каледжах і 30 установах спецыяльнай адукацыі. Падвозіць каля 12 800 дзетак на заняткі гатовы 321 школьны аўтобус. Дарэчы, аўтапарк школьнай тэхнікі Міншчыны абноўлены, у яго складзе з'явіліся 22 новыя адзінкі. Дзевяць аўтобусаў — з пад'ёмнікамі для дзяцей-інвалідаў. На падрыхтоўку ўстаноў адукацыі да новага навучальнага года ў рэгіёне запланавана звыш BYN113 млн.

СТАР. 7

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ ВЫМУШАНЫЯ КАНТРАЛЯВАЦЬ ГЭТЫЯ ТАВАРЫ І БУДЗЕМ ІХ КАНТРАЛЯВАЦЬ, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НІ НА ШТО»

Галоўная мэта — па максімуме захаваць аб'ёмы вытворчасці і экспарту

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную пытанням удасканалення парадку вытворчасці і рэалізацыі тытунёвых вырабаў у краіне. Гэта адна з самых даходных для бюджэту галін. Але сітуацыя на рынку змянілася, таму неабходна вырашыць, як захаваць аб'ёмы вытворчасці і экспарту.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ўжо 30 гадоў на вытворчасць і рэалізацыю такіх тавараў як тытунь, алкаголь уведзена дзяржаўная манаполія. «Мы вымушаныя кантраляваць гэтыя тавары і будзем іх кантраляваць, нягледзячы ні на што», — заўважыў ён. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў пачатку 2000-х гэта тэма стаяла надзвычай востра. Тады быў прыняты шэраг рашэнняў па падтрымцы тытунёвай галіны, якія дазволілі загрузіць вытворчыя магутнасці і атрымаць дадатковыя даходы ў бюджэт. «У развіццё гэтага шэсць гадоў таму быў рэалізаваны інвестыцыйны праект па стварэнні спецыялізаванай недзяржаўнай збытавай сеткі тытунёвых вырабаў і развіцці экспартных паставак», — нагадаў беларускі лідар. Больш за тое, падкрэсліў Прэзідэнт, былі знойдзены магчымасці нівеліраваць наступствы санкцый і поўнасцю забяспечыць айчынную вытворчасць сыравінай і матэрыяламі. Як вынік, тытунёвая галіна па-ранейшаму застаецца адной са значных крыніц папаўнення бюджэту. Чысты эфект па выніках 2023 года склаў 2,5 мільярда рублёў.

«Але так было ўчора. Сённяшнія тэндэнцыі не могуць не насцярожваць, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Прычыны могуць быць розныя, але неабходна выпрацаваць меры, каб зыходзячы з інтарэсаў дзяржавы і працоўных калектываў па максімуме захаваць аб'ёмы вытворчасці і экспарту».

Прэзідэнт паставіў перад адказнымі за гэтую сферу канкрэтныя пытанні — як у існуючых умовах працуе гродзенская фабрыка, якія ёсць магчымасці для эфектыўнай работы і развіцця? Ён спытаў, як працуюць іншыя прадпрыемствы. Пацікавіўся кіраўнік дзяржавы і сітуацыяй з экспартам. «Ці ўсе рэзервы задзейнічаны для забеспячэння эфектыўнай дзейнасці тытунёвай галіны ў цэлым? Што з ўнутраным рынкам? Якія прапановы па ўдасканаленні парадку вытворчасці і рэалізацыі тытунёвых вырабаў ёсць ва ўрада?» — спытаў ён.

На нараду былі запрошаныя кіраўнікі розных тытунёвых прадпрыемстваў. Прэзідэнт запатрабаваў ад іх, нягледзячы на прысутнасць канкурэнтаў, казаць шчыра і адкрыта пра свае праблемы. Акрамя таго, па словах Прэзідэнта, не трэба «рыдаць, што рынак звузіўся» і наракаць на іншыя прычыны.

Генеральны дырэктар ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» Юрый Чарнышоў далажыў аб мерах, якія прымаюцца для забеспячэння эфектыўнай дзейнасці прадпрыемства. Па яго словах, у 2024 годзе фабрыка выпусціць 23 мільярды цыгарэт, і мяркуецца, што сёлета атрымае 69 мільёнаў прыбытку. Прадпрыемства загружана на 72 працэнты. Пасля нарады, у размове з журналістамі Юрый Чарнышоў асобна падкрэсліў, што прадпрыемства адаптавалася да работы ва ўмовах санкцыйнага ціску. Таксама па яго словах, у хуткім часе будзе значна пашыраны асартымент прадукцыі фабрыкі.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

ДАДАТКОВЫХ ФІНАНСАВЫХ УКЛАДАННЯЎ У ПАДТРЫМАННЕ ГАЛІНЫ З БОКУ ДЗЯРЖАВЫ НЕ ПАТРАБУЕЦЦА

Алег ЖЫДКОЎ, старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам», у размове з журналістамі заўважыў, што тытунёвая галіна заўсёды знаходзілася пад пільнай увагай дзяржавы. «Гэта зразумела, таму што дастаткова спецыфічны бізнес і тут немагчыма без спецыяльнага кантролю дзейнасці. Даходы ў бюджэце таксама моцна залежаць ад работы нашых прадпрыемстваў», — падкрэсліў ён. Сёння ў Беларусі працуюць тры дзяржаўныя прадпрыемствы, якія забяспечваюць максімальную загрузку прадукцыяй. Але нюанс заключаецца ў тым, што ўсе нашы фабрыкі знаходзяцца пад моцным санкцыйным ціскам. «Зыходзячы з гэтага, патрэбна вырашэнне шэрагу пытанняў, якія дадуць магчымасць перабудаваць прынцыпы работы прадпрыемства для таго, каб забяспечыць прадпрыемствы сыравінай, заказамі і забяспечыць запланаваныя паступленні ў бюджэт. І што самае галоўнае — забяспечыць далейшы кантроль за тытунёвым рынкам, што дасць магчымасць апярэдзваць негатыўныя моманты, якія магчымыя з боку нашых недружалюбных партнёраў», — растлумачыў Алег Жыдкоў. Ён расказаў, што на нарадзе былі прынятыя рашэнні адносна таго, як тытунёвая галіна будзе развівацца з 2025 года, расстаўлены акцэнты, якія даюць магчымасць планаваць работу па вытворчасці і выкананні заказаў нашымі прадпрыемствамі. «Гэта ўсё патрабуе далейшай дэталізацыі для таго, каб кожны разумеў сваю зону адказнасці. Вырашаліся пытанні арганізацыйнага характару, дадатковых фінансавых укладанняў у падтрыманне галіны з боку дзяржавы не патрабуецца. Нашы прадпрыемствы самастойныя і маюць напрацаваны вопыт, які дазваляе ім планаваць самастойнае развіццё. Таму дапамогі як такой мы не прасілі, наадварот, выклалі падыходы ў арганізацыі работы, якія патрабуюць узгаднення з кіраўніком дзяржавы», — адзначыў Алег Жыдкоў.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокія спачуванні начальніку ўпраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Вячаславу Станіслававічу КУДЫМАВУ ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

«Людзей трэба знаходзіць, якія не ныюць, не плачуць, а працуюць на тым, што ёсць»

Працягваючы рабочую паездку па Гомельшчыне, Прэзідэнт не толькі азнаёміўся з ходам уборачнай і пасяўной, але і прызначыў новага старшыню райвыканкама

Выхадныя Прэзідэнта Беларусі прайшлі ў рабочым рэжыме. Аляксандр Лукашэнка прадоўжыў паездку ў Палескі рэгіён, у цэнтры ўвагі кіраўніка дзяржавы былі пытанні развіцця аграрнага сектара.

Фота БелТА

У Петрыкаўскім раёне кіраўнік дзяржавы наведаў сельгаспрадпрыемства «Палессе-Аграінвест», заснавальнікам і ўласнікам якога з'яўляецца ААТ «Мазырскі НПЗ».

Першая тэма — пасяўная пад будучы ўраджай. У рэгіёне ўжо сеюць азімы рапс, свірэпіцу. «Вы лічыце, што пара ўжо рапс на поўдні сеяць? — спытаўся Прэзідэнт у старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко. — Я табе раіў бы не сеяць усё адразу, а ў 2-3 этапы, і зрабіць вывад. Трэба паглядзець, як на поўдні, у якія часы сеяць. Я баюся, з-за культуры земляробства, тэхналогіі ў Гомельскай вобласці, мы не справімся з ростам (раслін. — **«Зв.»**). Калі перарасце восенню, можа загінуць зімой».

Практыка паказвае, што ранняя сяўба можа даць вынік у выглядзе дадатковага ўраджаю, але трэба ўносіць спецыяльныя прэпараты, каб стрымаць рост. Гэта значыць усё ўпіраецца ў тэхналогію і культуру земляробства. «Ці ўнясуць у вас іх? Унесяце — добра. Я ў вашы тэхналогіі не ўмешваюся, але я на вашым месцы паспрабаваў бы ў 2-3 этапы. І параўнаць. Трэба паглядзець. Гэта ўсё ж такі поўдзень. Але я ў вашы тэхналогіі не ўмешваюся. Таму што яны складваюцца гадамі, людзі прывыкаюць», — заўважыў беларускі лідар.

Кіраўніку дзяржавы далажылі аб ходзе ўборачнай і іншых сельгасработ у рэгіёне. Для завяршэння ўборачнай патрэбна яшчэ шэсць пагодлівых дзён. Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што сёлета нават з улікам асаблівасцяў рэгіёна вільгаці хапала, але сярэдняя ўраджайнасць каласавых невысокая.

Прэзідэнт у сувязі з гэтым настройвае на эфектыўную работу і строгае выкананне ўсіх агратэхнічных працэсаў. «Гэта ідэальны год. Столькі вільгаці было. Трэба вучыцца. Калі б вы так усюды ў вобласці працавалі (як у гаспадарцы «Палессе-Аграінвест». — **«Зв.»**), таксама былі б на вышыні. Вылізана, пасеяна, роўненька ўсё», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Без тэхналогіі не трэба сеяць, асабліва ў Гомелі. Лепш мы падумаем, каму аддаць гэтае поле і гаспадарку. 20 ц/га — гэта не ўраджайнасць», — падкрэсліў ён. Прыклад — вырошчванне рапсу. Гэта адносна новая для аграрыяў культура, прыбытковая, але і затратная. На полі трэба праводзіць да двух дзясяткаў розных апрацовак. «Калі ты ўклаўся ў рапс добра, тады і атрымаеш вынік», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Не трэба забываць і пра кукурузу, арыентуе кіраўнік дзяржавы: «Ад кукурузы, напэўна, мы нікуды не пойдзем. Яна ў многім ратуе ў Гомельскай вобласці, ды і па ўсёй краіне. А кукуруза — гэта і зерне нядрэннае, і сакавітыя кармы, сілас».

За 2023 год прадпрыемства спрацавала з тэмпам росту валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі 101,5 працэнта да ўзроўню 2022 года. Пры гэтым выручка ад рэалізацыі прадукцыі была больш як на 12 працэнтаў большай. Атрыманы чысты прыбытак у памеры Br8,1 млн.

Па выніках работы ў студзені — чэрвені бягучага года валавая вытворчасць прадукцыі атрымана на ўзроўні 109,4 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года.

У складзе прадпрыемства працуе таварная ферма «Турок», якая пасля рэканструкцыі ў 2010 годзе была ўведзена ў эксплуатацыю. Тут ёсць шэсць жывёлагадоўчых памяшканняў для ўтрымання буйной рагатай жывёлы на 1469 жывёламесцаў.

«Калі ў цябе ўвесь час так, як цяпер, гэта тое, што трэба. Гэта ідэальна. У кожным раёне павінны быць такія кіраўнікі, якія ведаюць тэхналогію ўтрымання жывёл, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Вось гэта ідэальна для ўзнаўлення. Нічога больш не трэба».

На ферме Прэзідэнт азнаёміўся з тэхналагічным працэсам гадоўлі маладняку буйной рагатай жывёлы.

«Гэта самы нармальны варыянт. Цялят трэба трымаць пад дахам. Усе гэтыя клеткі — гэта глупства, асабліва поліэтыленавыя. Я паспрабаваў у сябе на ферме: калі горача, цяля ўсё спацелае і мокрае — дакладна захварэе. Гэта мы прывыклі — палацы, палацы. А жывёлам палацы не патрэбны. Ім чым прасцей, тым лепш. Акуратненька ўсё зроблена, — ацаніў убачанае Аляксандр Лукашэнка. — Трэба паставіць задачу: пры кожным комплексе мець вось такі лагер, дзе будзе трохтыднёвая жывёла».

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко далажыў кіраўніку дзяржавы аб планах па будаўніцтве і рэканструкцыі малочнатаварных комплексаў да 2031 года. Паводле яго слоў, да гэтага часу ў вобласці застанецца 340 малочнатаварных ферм (комплексаў). У рэгіёне плануецца рэканструяваць 190 малочнатаварных аб'ектаў пад гадоўлю маладняку, а таксама пабудаваць і рэканструяваць 86 малочнатаварных комплексаў. Пры гэтым будуць поўнасцю закрыты 111 малочнатаварных ферм.

«Мне вельмі падабаецца гэты комплекс. Ёсць вынік, што тут вам раіць. Рабіце так, як лічыце патрэбным», — рэзюмаваў беларускі лідар.

Тут жа на месцы дырэктар СУП «Палессе-Аграінвест» Аляксандр Верамееў атрымаў пасаду старшыні Петрыкаўскага райвыканкама. Рашэнне Прэзідэнт прыняў па прапанове старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко, які пацвердзіў, што Верамееў на новай пасадзе справіцца.

Аляксандр Лукашэнка ўжо ў самога Аляксандра Верамеева пацікавіўся, наколькі ён у тэме аб'яднання мясцовых гаспадарак, як ён глядзіць на гэтыя пытанні.

Абмеркаваўшы гэтыя тэхнічныя моманты, Прэзідэнт папярэдзіў, што ва ўсім раёне культура земляробства павінна быць, як у СУП «Палессе-Аграінвест».

«Добра, будзем лічыць, што з панядзелка ты — старшыня райвыканкама. Але май на ўвазе — тут добрая гаспадарка. Не дай бог знішчыце. Таму паглядзі, хто будзе тут працаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ва ўсім раёне трэба зрабіць, як у гэтай гаспадарцы. «Я ведаю яго біяграфію. Мне далажылі. Я ж не спантанна. Ён мясцовы, вырас тут. Сапраўдны паляшук, якіх я вельмі люблю і паважаю, — сказаў Прэзідэнт. — Вядома, глеба ў іх не гродзенская і не тураўская (па ўрадлівасці. — **«Зв.»**). І вось такіх людзей трэба знаходзіць, якія не ныюць, не плачуць, а працуюць на тым, што ёсць».

Прэзідэнт дадаў, што, калі атрымаецца, восенню ён яшчэ раз наведае Петрыкаўскі раён і азнаёміцца з работай новага кіраўніка. «Раскажаш, як ты пачаў працаваць. Паглядзі на кадры: хто застаяўся, хто хоча працаваць, хто — не. Як я заўсёды гавару, нельга разганяць людзей, нават калі ты разумееш, што іх трэба разагнаць. Трэба даць шанц чалавеку. Калі будзе патрэбна мая падтрымка, я гатовы», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Трэба, каб ён вырас як мінімум да Івана Іванавіча (былога кіраўніка Мінсельгасхарча, а цяпер старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко. — **«Зв.»**), каб мы яго назад забралі, а ён ужо разбіраўся з вобласцю», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

* * *

У нядзелю кіраўнік дзяржавы вывучыў сітуацыю і з вышыні, калі ўсё як на далоні. Аляксандр Лукашэнка агледзеў паўночны захад Гомельскай вобласці і паўднёвыя раёны сталічнага рэгіёна. З верталёта Прэзідэнт ацаніў ход уборачнай кампаніі, стан меліяраваных земляў і работу прадпрыемства «Слаўкалій».

Паводле БелТА.

На кантролі

ЯК САБРАЦЬ ДЗІЦЯ ДА ШКОЛЫ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла нараду па пытаннях цэнаўтварэння на элементы школьнай формы і іх асартыменту ў аб'ектах гандлю

«Мы сабраліся для таго, каб правесці нараду па пытанні забеспячэння школьнай формай навучэнцаў да новага навучальнага года. Мяне перш за ўсё цікавяць пытанні цэнавай палітыкі, асартыментнага пераліку, і, вядома, мы запрасілі міністра адукацыі для таго, каб ён праінфармаваў нас аб тым, якія падыходы ў новым навучальным годзе да школьнай формы, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Члены Савета Рэспублікі правялі маніторынг, пабывалі ў гандлёвых аб'ектах, паглядзелі, як сёння ажыццяўляецца продаж і які асартымент школьнай формы ў нашых гандлёвых сетках. Хачу сказаць, што гэта даручэнне Прэзідэнта мне як Старшыні Савета Рэспублікі і членам Савета Рэспублікі прааналізаваць гэтую сітуацыю».

Фота БелТА.

Па словах спікера, усе члены Савета Рэспублікі ўключыліся ў гэту работу. «Яны працуюць ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны, таму маніторылі гэту сітуацыю. У нас ёсць інфармацыя, якую яны падалі. Я сама наведала гандлёвыя аб'екты Віцебскай вобласці. Мы маніторылі асартымент для малодшых школьнікаў, сярэдняй школы і старшакласнікаў. Зразумела, што старшакласнікі сёння — гэта тыя хлопцы і дзяўчаты, якія практычна носяць дарослы памер, але мы ўсё роўна павінны разумець, што гэта школьнікі».

«Гэтыя пытанні для нас не новыя. Мы ўжо шмат разоў збіраліся. Вы давалі той асартыментны пералік, які павінен быць у нашых гандлёвых сетках. Пачатак жніўня, і кожны з бацькоў задумаўся над тым, як сабраць дзіця да школы. На нашай нарадзе прысутнічаюць таксама міністр гандлю, старшыня канцэрна «Беллегпрам», кіраўнікі швейных прадпрыемстваў, якія выпускаюць школьную форму, кіраўнікі гандлёвых прадпрыемстваў, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Швейныя прадпрыемствы выпускаюць у дастатковай колькасці школьную форму, і трэба разумець, што сёння патрэбна гандлёвым сеткам для таго, каб яны сабралі гэты асартыментны пералік, і што сёння яшчэ трэба зрабіць нам усім разам для таго, каб у найкарацейшыя тэрміны, у найбліжэйшыя дні мы забяспечылі ўсе гандлёвыя сеткі неабходным асартыментным пералікам школьнай формы».

Фота БелТА.

«Мы павінны з вамі сёння закрыць гэту тэму. Мы ведаем, колькі ў нас першакласнікаў, ведаем колькі ідзе ў сярэднюю школу дзяцей, колькі ў 10—11 класы. Давайце так: размова адкрытая і сумленная», — дапоўніла Наталля Качанава.

У нарадзе, як паведамляе БелТА, узялі ўдзел члены Савета Рэспублікі Ірына Ляўковіч, Уладзіслаў Татарыновіч, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей Багданаў, міністр адукацыі Андрэй Іванец, старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна Лугіна, кіраўнікі арганізацый гандлю і вытворцаў айчыннага легпрама.

Падрабязнасці нарады — у заўтрашнім выпуску «Мясцовага самакіравання».

Блізкая ўлада

КОЖНАЕ ПЫТАННЕ — ПАД УВАГУ

З чым прыйшлі людзі на асабісты прыём да Старшыні Палаты прадстаўнікоў

Кола пытанняў, з якімі звярталіся грамадзяне і прадстаўнікі юрыдычных асоб да Ігара СЕРГЯЕНКІ, было надзвычай шырокім: ад абароны праў спажыўцоў да прапаноў карэкціровак дзейнага заканадаўства. Геаграфію зваротаў таксама не назавеш вузкай: ад Брэстчыны да Магілёўшчыны. Дарэчы, пры разглядзе пытанняў з рэгіёнаў выкарыстоўвалася новая форма работы — відэа-канферэнц-сувязь, падчас якой прадстаўнікі мясцовых улад давалі пры неабходнасці свае тлумачэнні ў анлайн-рэжыме.

Што цікава, у абодвух выпадках выкарыстання сучасных тэхналогій пытанні былі падобнымі. Прадстаўнік Бабруйскага гарвыканкама тлумачыў становішча з капітальнымі рамонтамі жыллёвага фонду і дарог у горадзе. У прыватнасці ён адзначыў, што капрамонт дома, аб якім хадайнічала заяўніца, перспектыўнай праграмай адпаведных работ на 2023—2027 гады не плануецца. Старшыня Палаты прадстаўнікоў даручыў мясцовай уладзе разабрацца ў існуючай сітуацыі. «Я абяцаю ўзяць на кантроль ваша пытанне», — падкрэсліў ён.

Зварот жа з Баранавічаў закранаў якасць будаўнічых работ. Жыхар горада паскардзіўся на сапраўдныя будаўнічыя дэфекты ў доме. Як высветлілася, у ліпені 2020 года праводзілася абследаванне будынка з мэтай устанаўлення адпаведнасці апорных канструкцый палажэнням ТНПА. Па яго выніках зроблена выснова, што выяўленыя візуальныя дэфекты не змяншаюць апорнай здольнасці канструкцый, і рэкамендавана правесці рамонтныя работы. Пытанне ўзята на кантроль.

Прадстаўнікі таварыства ўласнікаў з Магілёва ў якасці вырашэння іх праблемы, сутнасць якой у захаванні права ўласнасці на паркоўку, пабудаваную за іх грошы, прапанавалі ўнесці змяненні ў адзін з артыкулаў Кодэкса аб зямлі. Ігар Сергяенка адзначыў, што пытанне сур'ёзнае і ўзяў яго на асабісты кантроль.

Таксама падчас асабістага прыёму прагучалі прапановы па ўнясенні змяненняў у дзейнае заканадаўства і ў частцы павелічэння памеру грашовага забеспячэння ваеннаслужачых тэрміновай службы, выплаты імі транспартнага падатку, магчымасці прадастаўлення ім крэдытных канікул.

Яшчэ адна заяўніца была не згодная з заключэннем медыка-сацыяльнай экспертызы аб зняцці статусу «інвалід дзяцінства» ва ўнучкі 2002 года нараджэння. Свае тлумачэнні па гэтым пытанні даў **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Валерый МАЛАШКА:** «Праблемы, якую ставіць грамадзянка, на самай справе не існуе. Дзяржава на ўсіх этапах сталення рабіла ўсё для таго, каб дзіця было ў першую чаргу адаптавана да жыцця і атрымала прафесію, што і адбылося. Сёння дзяўчына паспяхова працуе ва ўстанове аховы здароўя. У той самай, дзе назіралася, дзе яе лячылі, дапамагалі з сацыяльнай адаптацыяй. І па вялікім рахунку сама дзяўчына не агучвае вялікіх праблем. Разам з тым яны будуць узяты пад асобны кантроль, і мы паглядзім на гэтую сітуацыю з усіх бакоў».

Сярод іншых зваротаў — скарга на дзеянні банкаўскіх супрацоўнікаў пры выдзяленні крэдыту.

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.
Фота БелТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэм'ер-міністр Бангладэш падала ў адстаўку

Пра гэта паведаміла Al Jazeera са спасылкай на заяву начальніка штаба войска краіны генерала Вакер-Уз-Замана. У сваім звароце да нацыі начальнік штаба войска пацвердзіў, што Шэйх Хасіна сышла ў адстаўку і што краінай зараз будзе кіраваць часовы ўрад. Ён заклікаў грамадзян захоўваць давер да войска, якое, паводле яго слоў, верне мір у краіну. «Мы таксама забяспечым, каб перамагла справядлівасць у адносінах да кожнай смерці і злачынства, якія адбыліся падчас пратэстаў, — сказаў ён, заклікаўшы грамадскасць праявіць цярпенне і спыніць любыя акты гвалту і вандалізму. — Мы запрасілі прадстаўнікоў усіх асноўных палітычных партый, і яны прынялі наша запрашэнне і абавязаліся супрацоўнічаць з намі». У пачатку ліпеня ў розных гарадах Бангладэш пачаліся выступленні студэнтаў супраць сістэмы квот на працоўныя месцы для сваякоў — удзельнікаў вайны за незалежнасць 1971 года. Удзельнікі патрабавалі адстаўкі прэм'ер-міністра Бангладэш Шэйх Хасіны. Паступова абстаноўка ў краіне абвастрылася, маніфестацыі перараслі ў сутыкненні, у якіх загінулі больш за 300 чалавек. Па даных газеты The Daily Star, з пачатку беспарадкаў у рэспубліцы былі арыштаваныя не менш за 10 тысяч чалавек. Колькасць загінулых у антыўрадавых пратэстах у Бангладэш дасягнула 300 чалавек.

У КНДР аб'явілі аб нарошчванні ядзернага патэнцыялу

Аддзел па знешняй палітыцы МЗС КНДР папярэдзіў аб нарошчванні рэспублікай свайго ядзернага патэнцыялу для павышэння ступені гатоўнасці да вайны, паведамляе Цэнтральнае тэлеграфнае агенцтва Карэі (ЦТАК). Афіцыйнае паведамленне аддзела апублікавана ў сувязі з правядзеннем ЗША і Паўднёвай Карэяй на амерыканскай ваеннай базе ў паўднёвакарэйскім Пхентхэке правінцыі Кёнгіда вучэнняў Iron Mace з імітацыяй ядзернай аперацыі ў адказ на прымяненне ядзернай зброі Паўночнай Карэяй. «Гэта сведчыць, што план ядзернай вайны ЗША і РК з нанясення ядзернага ўдару па КНДР уступіў у практычную і канкрэтную стадыю рэалізацыі», — піша ЦТАК. «Безразважная ядзерная канфрантацыя ЗША ставіць перад намі больш ясную мэту і выбар для абароны інтарэсаў бяспекі дзяржавы, міру і стабільнасці ў рэгіёне», — падкрэслілі ў МЗС КНДР.

Падчас беспарадкаў у Вялікабрытаніі затрымалі больш за 420 чалавек

Аб гэтым паведаміла брытанскае выданне The Times. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Кір Стармер правёў пасяджэнне надзвычайнага ўрадавага камітэта Cobra на фоне эскалацыі сітуацыі з масавымі беспарадкамі. Антымігранцкія пратэсты праходзяць у Вялікабрытаніі ўжо некалькі дзён, у некаторых выпадках дэманстрацыі перарастаюць у сутыкненні з паліцыяй і пагромы. Вядома, што пратэстоўцы напярэдадні спрабавалі падпаліць гатэль для просьбітаў прытулку ў Ратэрэме, таксама быў учынены напад на будынак дзіцячай бібліятэкі ў Ліверпулі і цэнтр Citizens Advice у Сандэрлэндзе. Нападам таксама падвяргаліся мячэці, некаторыя магазіны былі разрабаваны. Некалькі паліцэйскіх у розных гарадах краіны пацярпелі падчас беспарадкаў. Пратэсты супраць мігрантаў пачалі набіраць абароты ў Вялікабрытаніі пасля гібелі трох дзяцей у выніку нападзення з нажом. Першыя беспарадкі пачаліся пасля распаўсюджвання непацверджанай інфармацыі аб тым, што нападнік — бежанец. Пазней стала вядома, што падазраваны нарадзіўся ва Уэльсе, але ў сям'і руандыйскіх мігрантаў.

На думку парламентарыя

ДЗЕЛЯ МІРУ І СТВАРАЛЬНАЙ ПРАЦЫ

На мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка наведаў Мазырскі раён — найбольш пацярпелы ад нядаўняга ўраганнага ветру. Тут у кароткія тэрміны практычна суткамі напралёт у сапраўды гераічным напружанні актыўна ўстараняюцца наступствы разбуральнай прыроднай сілы. А ў гутарцы з жыхарамі аграгарадка Прудок Прэзідэнт закрануў самую балючую тэму апошніх двух гадоў — вайну на Украіне. І ўвагу на гэтым пытанні лідар краіны акцэнтаваў невыпадкова.

Упэўнены, што ўбачыў Аляксандр Рыгоравіч у вачах простых працаўнікоў-палешукоў відавочнае: трагедыя з удзелам суседзяў — братоў-славян — хвалюе іх сёння значна больш, чым часовая адсутнасць электрычнасці або наяўнасць іншых выгод.

На самай справе мінулы ліпень даўся жыхарам Беларускага Палесся, як і многіх сельскіх раёнаў краіны, досыць няпроста. Зусім не тая цяпер вёска, чым 30 гадоў таму: усе выгоды цывілізацыі за гады незалежнасці краіны прыйшлі сюды. Да добрага вельмі хутка прывыкаеш. Але тыя ж мазыране-прудкоўцы разумелі, што ім трэба крыху пацярпець, дапамога абавязкова прыйдзе.

Дарэчы, спецыялісты ўсіх узроўняў і прафесій дагэтуль імкнуцца на маёй роднай Гомельшчыне зрабіць усё, каб нармалізаваць абстаноўку, вярнуць усю інфраструктуру ў ранейшае рэчышча. Той жа факт, як у старыя добрыя часы талакой вяскоўцы і гараджане выходзяць прыбіраць вуліцы, расчышчаць паркі і скверы, ліквідоўваць завалы на могілках, — кажа пра многае.

Найперш: мы навучыліся шанаваць тое, што набылі цяжкай працай, што маем не толькі ў матэрыяльным плане і што можам раптам страціць, а галоўнае — сталі згуртаванай і сталай нацыяй. Так, любую стыхію разам перажывём. Але зусім іншая справа — вайна!

Я сам сабе задаю пытанне: а як ім, мясцовым людзям, не хвалявацца? Праз некалькі дзясяткаў кіламетраў — беларуска-ўкраінская мяжа. А там — тэрыторыя ўсеагульнага болю. Там — вайна і смерць. Перажываюць вяскоўцы, каб не прыйшла крывавая бяда ў наш беларускі дом, як калісьці ў 41-м. Не для яе ж дзетак гадуюць. Выразна разумеюць, што гэтая вайна «да апошняга ўкраінца» вядзецца не па волі суседзяў-украінцаў, а па ўказцы дзядзькі Сэма і за яго грошы. Дзеля чаго толькі? Ды аднаго: калі не знішчыць, падзяліць на падканторльныя ЗША ўдзелы, прыбраць да сваіх рук прыродныя багацці, каб далей нажывацца, аслабіць Расію. І зусім «дзядзечка» не думае пра людзей-чалавекаў, асабліва — ненавісных яму ўсходніх славян. І як жа ім хочацца ўцягнуць у гэтую смяротную бойню спакойную і мірную Беларусь — самую сапраўдную сёння «Брэсцкую крэпасць»!

Так, зразумеў Прэзідэнт палешукоў з аднаго позірку. Ведае: народ наш па сваёй прыродзе — самы міралюбівы, моцны духам і працавіты. Як ніводнай нацыі ні ў Еўропе, ні на Захадзе, беларусам давялося перажыць за мінулыя стагоддзі столькі чорных дзён і страт, прайсці праз такія жудасныя выпрабаванні, што, мама, не гаруй. Такая сумная праўда: нашым продкам сотні разоў даводзілася мужна стаяць за родную зямлю. Абараніўшы і вызваліўшы яе ад чужаземнай пагані ў чарговы раз, у 45-м, народам выпакутавана *права жыць* на сваёй зямлі без чужых падказак і панукванняў. Прычым беларусы зусім не сляпыя: бачаць, што адбываецца каля нашых меж, знаюць і сваіх унутраных, і знешніх праціўнікаў, і, шчыра скажам, самых заклятых ворагаў. Дык няхай паўсюль нядобразычліўцы ведаюць: такі народ у выпадку чаго сваю зямлю больш нікому не дазволіць знішчаць!

Аляксандр Лукашэнка мае рацыю: беларускі народ на генетычным узроўні ўсё памятае...

Ніколі не забудзе, як падчас Вялікай Айчыннай Беларусь першай у СССР прыняла на сябе вельмі жорсткі ўдар магутнай гітлераўскай машыны і была цалкам разбурана. Такі «падарунак» быў нам ад цывілізаванай Еўропы. Беларусь паўстала супраць ненавіснага ворага! На акупаванай фашысцкімі «дабрадзеямі» тэрыторыі з імі змагаліся больш чым 400 тысяч партызан і каля 70 тысяч падпольшчыкаў. Кожнага з іх лічым і будзем заўсёды лічыць сапраўдным героем!

Мы не забудзем і не дадзім забыцца нікому: не нехта іншы, не скароная Еўропа, якая аддана служыла Гітлеру, а менавіта савецкі салдат, абапіраючыся на шматнацыянальную вялікую краіну, якая аддала ў імя Перамогі ўсё, што ў яе было, перамог «карычневую чуму».

Мы не забываем і бязмерна цэнім за тое, што выстаялі, за нястомную працу ўсіх — ад малога да вялікага — у час вайны і пасля яе. Аднаўленне ж краіны запатрабавала сапраўды тытанічных намаганняў. Менавіта так: гераічных! І гэта таксама цэлыя пакаленні герояў!

Таму я асабіста лічу ў адрозненне ад асобных прадстаўнікоў, у тым ліку і творчага цэха, ад збеглых за мяжу маю Беларусь *краінай герояў!*

І дзе ні бываю, куды ні закідвае лёс, кажу пра гэта проста: ганаруся сваімі продкамі і сваёй краінай! І буду ганарыцца!

Ганаруся тым, што за тры дзясяткі гадоў пад кіраўніцтвам богам данага нам кіраўніка, *чалавека ад зямлі,* абапіраючыся на вопыт продкаў, пераадолеўшы неймаверную разруху 90-х, мы змаглі пабудаваць сваю народную дзяржаву, дзяржаву для чалавека. Самі! І сваёй працай, сваёй верай, сваімі ведамі мы працягваем умацоўваць, развіваць не толькі эканамічны патэнцыял, але і найлепшыя традыцыі свайго народа.

Суседзі побач з намі дагэтуль дзівяцца: як змаглі ў такіх умовах выжыць гэтыя беларусы? Бо ззаду — страшны развал вялікай краіны і эканомікі ды цэлыя тры дзесяцігоддзі жудаснага ціску на маладую Беларусь звонку! Так, ніхто іншы, як нашчадкі фашыстаў або іх паслядоўнікі заўсёды прагнулі рэваншу за прайграную ў 45-м вайну, менавіта яны накладалі на нас санкцыі. Больш за ўсё ім не падабаецца наш лідар, бачыце! А вам — хочацца спытаць? — якая справа да выбару беларускага народа? Толькі таму, што аб'явілі сябе гаспадарамі свету?.. А чаго каштавала прыўнесеная звонку «рэвалюцыя пярамен» у 2020-м, дужа густа пасыпаная для асобных нашых грамадзян як маннай нябеснай дармовым долярам?! Не выйшла... Зрэшты, і да гэтага часу спрабуюць нам «перакрываць кісларод», шкодзіць, дзе толькі магчыма.

Так, з усімі нягодамі мы абавязкова справімся. Мы — моцныя. І адкрытыя для ўсяго свету. І «бязвіз» для 35 еўрапейскіх краін гэтую нашу адкрытасць пацвярджае: прыязджайце, глядзіце, дарагія суседзі, як беларусы адстаялі права жыць па сваім розуме, па законах, якія прымаюць *самі для сябе.* «Фашысцікі» наўрад ці паедуць да нас, а вось простыя людзі, якія хочуць міру і дабра сваім суседзям, ужо едуць. І робяць высновы. Найперш: дзе ж той славутай дэмакратыі больш: у нас ці на Захадзе?

Я ўпэўнены: каб украінская тэма не стала для нас рэальнасцю, мы, грамадзяне незалежнай Беларусі, павінны быць гатовыя да любога развіцця падзей, дбаць пра абарону рубяжоў нашых, але прытрымлівацца міралюбнай палітыкі на ўсіх узроўнях. І наша дзяржава гэта яскрава дэманструе!

А што да нас, людзей... Мы не проста павінны, а *абавязаны* працягваць эстафету бацькоў і дзядоў, працаваць па сумленні, захоўваць і прымнажаць іх спадчыну. І таксама, як старэйшыя пакаленні, любіць і берагчы сваю зямлю-маці, прышчапляць гэтую любоў нашым дзецям і ўнукам, не забываць пра патрыятычныя пачуцці. Не паказныя, а сапраўдныя. (Гэта, дарэчы, «дзве вялікія розніцы», хто разумее. Не трэба гэтага паказнога, галоўнае, каб патрыятызм сыходзіў з сэрца...)

Мы абавязаны штохвілінна, нястомна вучыць нашых дзетак дабру, прыстойнасці, сумленнасці, павазе да старэйшых, да грамадства, адно да аднаго, не забывацца на калектывізм і чуласць. У нас іншага рэцэпта, каб і ў будучыні супрацьстаяць любым нягодам, проста няма.

І яшчэ. Кожнаму з нас сёння трэба прыслухацца да даходліва сказаных такіх простых слоў нашым Прэзідэнтам. Вось яны: «На ўзроўні дзяржавы прымаюцца меры па забеспячэнні бяспекі краіны». «Беларусь пад надзейнай абаронай, падстаў для хвалявання няма...» «Але калі мы не хочам ваяваць — мы павінны працаваць, рабіць сваю справу. Працаваць на гэтым кавалку зямлі так, каб было, што пакінуць дзецям...» «Вядома, калі спатрэбіцца, кожны беларус возьме ў рукі зброю і будзе змагацца». «Аднак лепш шмат працаваць, але не ваяваць...»

Лепш працаваць!

Мудрыя словы мудрага палітыка, для якога ёсць толькі адзін клопат: наш беларускі народ.

Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ,
член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу па справах беларусаў замежжа, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь.

Надвор'е

КАРОТКАЧАСОВЫЯ ДАЖДЖЫ І НАВАЛЬНІЦЫ

У Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды паведамілі, што на гэтым тыдні жнівень наўрад ці парадуе нас устойлівым сонечным надвор'ем.

Першая яго палова адзначыцца навальнічнай воблачнасцю, якая прынясе кароткачасовыя дажджы ў большасць раёнаў краіны. Паветра прагрэецца не вышэй за 19—28 градусаў. У чацвер фон атмасфернага ціску пачне расці, аблокаў стане менш і ападкі прымуць лакальны характар. Іх размеркаванне па тэрыторыі краіны будзе нераўнамерным. Пры гэтым паўднёва-заходнія паветраныя патокі прынясуць у рэспубліку больш цёплае паветра, і тэмпературны фон пачне набліжацца да сваёй кліматычнай нормы. Але перадых будзе нядоўгім. Згодна з папярэднім прагнозам у пятніцу і надыходзячыя выхадныя атмасферныя франты і няўстойлівыя паветраныя масы вернуць кароткачасовыя дажджы ў большасць раёнаў краіны: яны пройдуць у аўторак ноччу месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. У начны і ранішні час месцамі згусціцца туман. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 11—17 градусаў, днём — 21—27 градусаў вышэй за нуль.

Кароткачасовыя дажджы чакаюцца і 7 жніўня — ноччу месцамі, а раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны. У асобных раёнах навальніцы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад 9 да 16 градусаў цяпла, днём — ад плюс 19 — па паўночным усходзе да 28 градусаў — па паўднёвым захадзе.

У чацвер, 8 жніўня, ноччу месцамі па паўночным усходзе, а днём у асобных раёнах краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Начная тэмпература паветра дасягне плюс 9—15 градусаў, дзённая — 22—29 градусаў цяпла.

Таксама на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і ў пятніцу, у асобных раёнах навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Уначы слупкі тэрмометраў пакажуць плюс 11—18 градусаў, а днём — 22—29 градусаў вышэй за нуль. Па паўночным захадзе месцамі будзе 19—21 градус цяпла.

10 жніўня на большай частцы краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, з навальніцамі ў асобных раёнах. Тэмпература паветра ноччу будзе ў межах ад плюс 11 да плюс 18 градусаў, днём — ад 19 да 26 градусаў цяпла. На поўдні паветра прагрэецца да плюс 28 градусаў.

Нядзеля таксама не абяцае сухога сонечнага надвор'я. Месцамі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы сіноптыкі абяцаюць 10—17 градусаў цяпла, а днём — ад плюс 20 па паўночным усходзе да 28 градусаў па паўднёвым захадзе.

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.

ЗАЛАТЫ ЛІТВІНОВІЧ І СЯРЭБРАНЫ ЗАЛАТЫ

Тры медалі — тры неверагодныя гісторыі прынёс беларусам першы тыдзень Алімпіяды

У свеце няма падзеі больш цікавай і прыцягальнай, чым Алімпійскія гульні. Нават, калі тэмай для размоў становяцца скандалы, палітычныя інтрыгі, культурныя рознагалоссі — Алімпійскія гульні абмяркоўваюць ва ўсім свеце. І той, няхай вельмі сумны факт, што Алімпіяды абрастаюць зусім не спартыўнымі інфамарцыйнымі нагодамі, пацвярджае, што быць абыякавым да галоўнага старту чатырохгоддзя немагчыма. На шчасце, нягледзячы ні на што, пакуль на Алімпійскіх гульнях усё ж такі перамагае спорт. Перамагае сумленная, чэсная барацьба, у якой наймацнейшыя ў сваёй справе людзі бліскуча выконваюць сваю работу, радуюць сваіх аматараў, не звяртаючы ўвагі ні на што. Менавіта гэта ў першы тыдзень Алімпійскіх гульняў у Парыжы паказалі беларускія спартсмены. Яны прыехалі ў сталіцу Францыі зусім невялікім прадстаўніцтвам — 17 чалавек. Упершыню ў гісторыі яны выступалі ў нейтральным статусе, без сцяга, гімна, упамінання сваёй краіны. Яны пераадолелі мноства лагістычных непрыемнасцяў на гэтым шляху. І ўсё дзеля таго каб паказаць усяму свету, на што яны здольныя.

НІ АДНА ПЕРАМОГА НЕ ДАВАЛАСЯ ПРОСТА

«Чаканы сюрпрыз» — менавіта так можна апісаць выступленне беларускіх батутыстаў на Алімпійскіх гульнях у Парыжы. Дзве Алімпіяды запар на найвышэйшую прыступку п'едэстала падымаліся беларусы. Але тое ў мужчынскіх спаборніцтвах. Сёлетнія Гульні прынеслі Беларусі першы медаль у жаночых. І гэта стала сапраўдным сюрпрызам для ўсіх. Самым прыемным сюрпрызам. Віялеце Бардзілоўскай — 19 гадоў. Яе найлепшы вынік у гэтым сезоне — 10-е месца на этапе Кубка свету. Ліцэнзію на Алімпійскія гульні яна заваявала, заняўшы апошняе месца ў кваліфікацыі. Вялікіх надзей на спартсменку не ўскладалі. А яна даказала ўсім скептыкам, што яны дарма не верылі ў яе здольнасці. У фінале Віялета выступала першай. Планку ў 56,060, якую яна задала, змагла пераадолець толькі брытанская спартсменка Брыоні Пейдж — яе выступленне суддзі ацанілі на 56,480 балаў. Вынік фіналу справядлівы — Брыоні Пейдж 33 гады. У яе актыве ўжо ёсць сярэбраны і бронзавы медалі Алімпійскіх гульняў, цяпер яна заваявала і залаты. З улікам узросту гэта можа быць апошняя Алімпіяда брытанкі. А ў маладой Віялеты Бардзілоўскай усё яшчэ наперадзе, у тым ліку і залаты медаль Алімпійскіх гульняў. Пасля Парыжа ні ў каго не застанецца сумненняў у сілах гэтай дзяўчыны.

Ад алімпійскага чэмпіёна Токіа Івана Літвіновіча ўсе чакалі такога ж паспяховага выступлення, як і ў 2021 годзе. Такі лёс у алімпійскіх чэмпіёнаў — жыць і выступаць пад ціскам чаканняў у свой адрас. Іван Літвіновіч у Парыжы справіўся з гэтым на выдатна. «Невялікае хваляванне і перад спаборніцтвамі, і падчас іх, вядома, прысутнічала. Імкнуўся пераключыць увагу, размаўляў з трэнерам, не глядзеў, як хлопцы выступаюць. Сапернікі паказвалі выдатныя вынікі, гэта магло збіць з настрою. Але ж я абараніў тытул чэмпіёна Гульняў — выдатна! Адзначу, што мне ні адна перамога не давалася проста», — дзяліўся з журналістамі беларускі спартсмен. У фінале індывідуальнага турніру па скачках на батуце ён набраў 63,090 бала, што забяспечыла яму залаты медаль. Цяпер Іван Літвіновіч — першы і адзіны двухразовы алімпійскі чэмпіён па скачках на батуце! Фенаменальнае дасягненне! У гісторыі беларускага спорту суверэннага перыяду не так шмат людзей, якія маюць некалькі залатых медалёў з Алімпійскіх гульняў. У зімовых відах Дар'я Домрачава — чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка, у летніх — Кацярына Карстэн двойчы падымалася на найвышэйшую прыступку алімпійскага п'едэстала. Таму перамога Івана Літвіновіча ва ўсіх сэнсах гістарычная.

«Дарагі Іван! Ты — наш гонар! Дзякую за алімпійскае «золата». Мільёны беларусаў сёння захапляюцца тваёй воляй да перамогі, мэтанакіраванасцю і сілай характару. Перамагчы на Алімпіядзе — вялікае дасягненне, а абараніць тытул алімпійскага чэмпіёна — спартыўны подзвіг, якім ты паставіў сябе ў адзін шэраг з самымі выдатнымі атлетамі свету», — павіншаваў чэмпіёна Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

За «парыжскую сенсацыю» на батуце вялізны дзякуй варта сказаць трэнеру Вользе Уласавай. Менавіта яна тры алімпійскія цыклы запар прыводзіць сваіх выхаванцаў да медалёў. Менавіта яна ўвасабляе віцебскую школу скачкоў на батуце, якая сёння, без перабольшання, вядомая на ўвесь свет. Амаль два гады адхілення ад міжнародных стартаў Вольга Уласава не давала сваім спартсменам расслабляцца. Дзеля чаго — усе ўбачылі ў Парыжы. «Ад усёй душы віншую трэнераў і спецыялістаў, якія ўклалі ў гэтую перамогу свае талент і майстэрства. Беларуская школа скачкоў на батуце чарговы раз прадэманстравала найвышэйшы клас і пацвердзіла заслужанае лідарства на сусветнай арэне», — гаворыцца ў віншаванні кіраўніка дзяржавы.

ВЯСЛЯРНЫ ТРЫЛЕР

У гісторыі беларускага акадэмічнага веславання — сем алімпійскіх медалёў. І ўсе яны жаночыя. Менавіта так было да гэтых Алімпійскіх гульняў. Першы для суверэннай Беларусі алімпійскі медаль у мужчынскім акадэмічным веславанні заваяваў Яўген Залаты. Ён стаў сярэбраным прызёрам на дыстанцыі 500 метраў. Выдатнае дасягненне атрымалася сапраўды кіношным. У французскую сталіцу веславыя-акадэмікі прыбылі першыя, але без сваіх лодак, без якіх яны як без рук і без ног. У Еўрапейскім саюзе ёсць забарона на правоз лодак, інвентар давялося арандаваць і экстрана прывыкаць да яго. Вяслярны канал, дзе праходзілі спаборніцтвы, — прыродны вадаём, а не штучна выкапаны канал. А гэта заўсёды непрадказальна. У папярэднім заездзе Яўген фінішаваў першым. Дзень, калі ён упэўнена прайшоў чвэрцьфінал, запомніцца яму на ўсё жыццё. 30 ліпеня ў Яўгена Залатога нарадзіўся сын. Маладому бацьку паведамілі пра гэта толькі пасля заезду, каб не губляў канцэнтрацыю. Але шчаслівая навіна не перашкодзіла Залатому ў паўфінале пераўзысці алімпійскі рэкорд, адабрацца ў фінал. І вось дзень заключнага заезду. Здаецца, перашкодзіць не можа нішто, але аўтобус, на якім Яўген Залаты едзе на вяслярны канал, ламаецца. «Такія цяжкасці нас гартуюць. Мы ж іх любім. Гэта ўмацавала маю рашучасць, і атрымалася «серабро». Мы хвілін 20 ехалі на гэтым аўтобусе, але ў яго села батарэя. Гібрыдны аўтобус. Мы патэлефанавалі і папярэдзілі, каб не выходзілі сапернікі на ваду», — скажа потым Яўген журналістам.

Аўтобус зламаўся, а рашучасць спартсмена — не. У пачатку фінальнага заезду Яўген быў шостым, але на апошнім адрэзку дыстанцыі абышоў амаль усіх сапернікаў. Запаветны медаль прынёс вынік — 6 хвілін 42,96 секунды. Чэмпіёнам стаў немец Олівер Цайдлер, які на пяць секунд апярэдзіў беларуса, бронзу ўзяў галандзец Сымон ван Дорп.

Нараджэнне сына, доўгачаканы медаль насуперак усяму — менавіта за такія гісторыі мы і любім спорт. «Праявіўшы волю, вытрымку і зайздроснае тактычнае майстэрства, ты прадоўжыў слаўныя пераможныя традыцыі айчыннага акадэмічнага веславання, напоўніў радасцю і гонарам сэрцы беларускіх балельшчыкаў. Думаю, што гэты алімпійскі поспех стаў сапраўдным падарункам у гонар нараджэння сына, з чым мы цябе таксама горача віншуем», — падкрэсліў у сваім віншаванні Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

«Вядома, зараз адчуваю гонар. Гэтага поспеху дабіўся дзякуючы нашай камандзе. Шчаслівы знаходзіцца тут, сярод сяброў. У Парыжы здавалася, што я адзін, але разумеў, што за плячыма стаіць вялізная сям'я, таму стараўся выкласціся па максімуме», — дзяліўся з журналістамі Яўген Залаты.

БЕЗ МЕДАЛЁЎ, АЛЕ З ДОСВЕДАМ

Таццяна Клімовіч у спаборніцтвах па акадэмічным веславанні заняла восьмае месца. Па ходзе турніру ў жаночай адзіночцы на 2000 метраў беларуска пераадолела папярэднюю і чвэрцьфінальную стадыі, але ў паўфінале не змагла прабіцца ў вырашальны заезд і адправілася ў фінал В, дзе разыгрываліся месцы з 7-га па 12-е. У суцяшальнай гонцы Клімовіч паказала вынік 7 хв. 25,61 сек. і фінішавала другой, прапусціўшы наперад толькі немку Аляксандру Фостэр.

Адзіная прадстаўніца Беларусі ў веласіпедным спорце Ганна Церах скончыла сваё выступленне на Алімпійскіх гульнях. У жаночай групавой гонцы на 158 кіламетраў Ганна некаторы час была сярод лідараў. Але да фінішу беларуская спартсменка прыехала 61-й. У жаночай гонцы з раздзельным стартам Ганна паказала 29-ы вынік.

Найлепшы вынік беларускіх спартсменаў у парыжскім басейне для плавання — восьмае месца. Аліна Змушко заняла гэтую пазіцыю па выніках заплыву на 100 метраў брасам. Дарэчы, у паўфінале на гэтай дыстанцыі Аліна аднавіла ўласны нацыянальны рэкорд — 1 хв. 05,93 секунды. «У прынцыпе, выступленне ацаню на здавальняюча, я абнавіла рэкорд Беларусі. У фінале ўсё далося крыху цяжэй, эмацыянальна або фізічна — будзем разбірацца. Галоўнае — зрабіць правільныя высновы», — дзялілася Аліна пасля стамятроўкі. На дыстанцыі 200 метраў брасам Аліна Змушко скончыла сваё выступленне па выніках папярэдніх заплываў. Яе вынік у 2 хв. 28,19 секунд аказаўся 21-м, а ў паўфіналы прайшлі 16 мацнейшых спартсменак. У фінал на дыстанцыі 200 метраў на спіне прабілася Анастасія Шкурдай. Яе вынік у 2 хв.10,63 секунды забяспечыў ёй восьмае месца, на дыстанцыі 100 метраў на спіне яна размясцілася на 20-й пазіцыі. Такім чынам, нікому з беларускіх плыўцоў не ўдалося заваяваць алімпійскія медалі. Да гэтага Ілья Шымановіч на сотні брасам паказаў 10-ы вынік.

Дэбютантка Алімпійскіх гульняў Дар'я Чупрыс скончыла сваё выступленне на 24-м месцы ў спаборніцтвах па стральбе з вінтоўкі ў трох становішчах. У кожным з практыкаванняў (стральбе лежачы, стоячы і з калена) Чупрыс набрала па 193 балы з 200, агульны вынік Дар'і склаў 579 ачкоў, што прынесла ёй выніковае 24-е месца. Не адабралася ў фінал і яшчэ адна беларуска Аляксандра Пятрова. У спаборніцтвах па стральбе з малакалібернага пісталета на 25 метраў яна набрала 288 балаў з 300, што адпавядала 23-му месцу, а ў практыкаванні на хуткасць вынік нашай спартсменкі ў 278 ачкоў аказаўся 40-м. За абодва віды праграмы Пятрова зарабіла 566 балаў і размясцілася на выніковым 39-м радку.

На гэтым выступленні беларусаў у Парыжы не заканчваюцца. 7 жніўня свае выступленні пачнуць барэц грэка-рымскага стылю Абубакар Хаслаханаў і адзіны прадстаўнік Беларусі ў таэквандо Георгій Гурцыеў, 8 жніўня ў барацьбу за медалі ўступяць весляры на байдарках і каноэ — у гэтым відзе нашу краіну прадставяць Уладзіслаў Кравец і Юлія Трушкіна. У пятніцу 9 жніўня пачынаем балець за барца вольнага стылю Магамедхабіба Кадзімагамедава. У Токіа ён заваяваў сярэбраны медаль і абяцаў вярнуцца па «золата», павінна быць цікава. Цяжкаатлетам Яўгену Ціханцову і Сюзане Валадзько, якія выйдуць на памост у пятніцу, таксама ёсць што сказаць.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота БелТА.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объекта недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 5 %):

№ объекта	Характеристика имущества	Местонахождение имущества	Начальная цена
1	Капитальное строение (назначение: здание специализированное финансового назначения; наименование: административное здание) с инвентарным номером 254/С-8511, общей площадью 157,0 кв. м	Витебская обл., Миорский район, г. Дисна, ул. Первомайская, 3	35 640,00 (тридцать пять тысяч шестьсот сорок рублей 00 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 5 940,00 (пять тысяч девятьсот сорок рублей 00 копеек)

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 **в срок до 16.00, в пятницу до 15.00 по 10.09.2024.**

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 10.09.2024 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

Аукцион состоится 12.09.2024 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ.

Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретает объекты основных средств по стоимости 598,28 руб. (в т. ч. НДС 20 %): кондиционер TADIRAN GTM 24H (инв. номер 2149900002137822), металлический пандус с поручнями (инв. номер 2149900213003088), насос циркуляционный AVE Titan RS25-60-180 (инв. номер 554100), электрический счетчик ЭЭ8005/2 (инв. номер 214020021300936).

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее, чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19.

Пасведчанне № 01-309 аб пастаноўцы на ўлік, выдадзеннае пярвічнай арганізацыі Баранавіцкага камунальнага ўнітарнага вытворчага прадпрыемтсва «Гарсвет» Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», пастаўленае на ўлік рашэннем Баранавіцкага гарадскога выканаўчага камітэта ад 13 мая 2008 года № 1105, **лічыць несапраўдным у сувязі са стратай.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже пустующего жилого дома в г. Лепеле

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

Лот № 1. Жилой дом: кап. строение с инв. № 230/С-3183, площадью 57,9 кв. м, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Первомайская, 56, назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом (износ – 65 %), составные части и принадлежности: двое сеней, терраса, гараж. сарай (износ – 65 %). Характеристика жилого дома: одноэтажный 1966 г. п., фундамент бутовый, стены бревенчатые, полы дощатые, перекрытия, проемы деревянные, кровля шиферная, бесхозяйное имущество. Инженерные коммуникации: электроосвещение – открытая проводка, отопление – печное, водопровод, газоснабжение и канализация – нет. Жилой дом расположен на земельном участке с кадастровым № 222750100001003737, площадью 0,2256 га.

Нач. цена: 9300,00 бел. руб.

Задаток: 930,00 бел. руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 09.09.2024 в 12.00 по адресу: 211174, Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Ленинская, 6 в Лепельском районном исполнительном комитете».

Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 07.08.2024 до 17.30 06.09.2024. Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются в рабочие дни с 08.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Задаток перечисляется на р/с: BY68 AKBB 3604 3190 0102 5210 0000 ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300039625, код операции 40901. Получатель платежа: Лепельский райисполком.

Условия для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на приобретение лота по начальной цене, увеличенной на 5 %.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

внести плату за предмет аукциона (часть платы в случае предоставления письменного заявления о предоставлении рассрочки) путем перечисления денежных средств в местный бюджет, ГУ МФ РБ по Витебской области, Резидент Республики Беларусь на счет № BY90AKBB36003190000090000000 УНП 300594330 БИК AKBBBY2X, код платежа 4805;

возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с проведением оценки рыночной стоимости предмета аукциона, с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;

обратиться в отдел землеустройства райисполкома с заявлением о предоставлении земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона.

В течение 10 рабочих дней после совершения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона вышеуказанных действий обратиться в отдел архитектуры и строительства, жилищно-коммунального хозяйства райисполкома для заключения договора купли-продажи предмета аукциона.

После принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка обратиться за государственной регистрацией земельного участка и предмета аукциона в Лепельский филиал РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», а в случае предоставления земельного участка на праве аренды – также заключить договор аренды земельного участка и обратиться за его государственной регистрацией в Лепельский филиал РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» и Положением о порядке продажи без проведения аукционов пустующих жилых домов, организации и проведения аукционов по их продаже, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 сентября 2021 г. № 547.

Для участия в аукционе приглашаются: граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, лица без гражданства (далее – граждане), индивидуальные предприниматели и юридические лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц), которые лично либо через своего представителя подают в комиссию в установленный в извещении срок заявление об участии в аукционе, предоставляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по продаже пустующих жилых домов. Предоставляется: гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивид. предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юр. лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее 12 месяцев до подачи заявки) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должны быть засвидетельствованы нотариусом или лицом, уполномоченным совершать нотариальные действия), доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должны быть засвидетельствованы нотариусом или лицом, уполномоченным совершать нотариальные действия). Документы, составленные за пределами Республики Беларусь в соответствии с законодательством иностранного государства, должны быть легализованы, если иное не предусмотрено законодательством. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, а руководитель – документ, подтверждающий полномочия. Консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе без нотариального засвидетельствования. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников в отношении предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с проведением оценки рыночной стоимости предмета аукциона, с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходах, связанных с проведением оценки рыночной стоимости жилого дома, с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. В случае отказа или отклонения победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона от внесения платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с проведением оценки рыночной стоимости пустующего жилого дома, изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, незаключения договора купли-продажи, незаключения договора аренды земельного участка внесенный задаток возврату не подлежит. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» **10 сентября 2024 года** проводит **открытый аукцион № 5-АЧ-24 по продаже права заключения договора аренды** недвижимого имущества, находящегося в частной собственности (далее – имущество)

№ предмета аукциона	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента спроса к базовой ставке арендной платы (от 0,3 до 3) или размер арендной платы в БАВ	Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.)	Целевое использование имущества	Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения
Арендодатель – Открытое акционерное общество «Рыбокомбинат «Любань», тел.: 801794 68350, 68352						
1	Минская область, Любанский район, г. Любань, ул. Боровика, 6/1	1961,50	3,0 (441 БАВ за всю площадь)	2612,72	Здание специализированное для производства продуктов питания, цех по производству рыбных консервов	Отдельно стоящее одноэтажное здание, наличие отопления и технологического оборудования, санитарного узла, естественного освещения, энергоснабжения, водоснабжения, газоснабжения, канализации, пожарной сигнализации, отдельного входа. Аренда помещения с оборудованием. Стоимость аренды оборудования 51 593,00 рублей. **Срок аренды – 1 год**

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.

Форма торгов – открытый аукцион на повышение начальной цены.

Аукцион состоится **10 сентября 2024 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 6 августа 2024 г. по 6 сентября 2024 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

Порядок оформления участия в аукционе:

К участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявления на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Для участия в аукционе лица, желающие участвовать в нем, подают организатору заявления на участие в аукционе с приложением следующих документов:

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3 985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901. **Назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 5-АЧ-24 по предмету аукциона № 1.** Сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов;

• копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования – для юридических лиц или индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

• копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения – для иностранных юридических лиц.

При подаче заявления на участие в аукционе:

физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, желающее участвовать в аукционе, предъявляет документ, удостоверяющий личность;

представитель лица, желающего участвовать в аукционе, предъявляет: документ, удостоверяющий личность; доверенность, за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель; документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы, подтверждающие полномочия), если юридическое лицо представляет его руководитель.

Документы, составленные на иностранном языке, должны представляться (предъявляться) с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должны быть засвидетельствованы нотариально).

Порядок определения победителя аукциона:

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности, утвержденным организатором аукциона (далее – Порядок).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион начинается с объявления аукционистом наименования, местонахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион (далее – победитель аукциона).

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю аукциона.

Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

Дополнительная информация:

возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Порядком, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона).

Телефоны для справок: отдел аукционов – +375 (17) 360 42 22, бухгалтерия – + 375 (17) 366 36 58.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

ТРЫ Ў АДНЫМ

АТРЫМАЛЬНІКІ — 3,5 МІЛЬЁНА ЧАЛАВЕК

Гэты сезон стаў асаблівым для падаткавікоў, цяпер яны будуць рассылаць паведамленні пра адзіны маёмасны плацеж два месяцы — з 1 жніўня да 1 кастрычніка (раней было да 1 верасня). Іх атрымаюць 3,5 мільёна жыхароў нашай краіны. Адзіны маёмасны плацеж — гэта не новы падатак, а спосаб аплаты трох маёмасных падаткаў (на нерухомасць, зямельнага і транспартнага). Цяпер усе тры віды падаткаў будуць у адным паведамленні, а не ў розных, як раней. Гэта зроблена ў першую чаргу для зручнасці плацельшчыкам, растлумачыў прадстаўнік МПЗ.

Не трэба, як некалькі гадоў таму, атрымліваць некалькі паведамленняў ад розных раённых інспекцый: адно за кватэру ў Мінску, іншае за лецішча на Вілейшчыне. Плацельшчыкі адразу бачаць у адным паведамленні ўсе аб'екты падаткаабкладання, разлік падатку па кожным аб'екце і агульную суму да аплаты.

Па словах Андрэя Кавалеўскага, раней у АРІП трэба было аплачваць кожны падатак асобна, а таму перыядычна людзі аплачвалі падаткі «не туды», узнікала блытаніна.

«Цяпер плацеж аплачваецца адной сумай. Але, атрымаўшы паведамленне, вы не павінны ўнесці ўсю суму. Як і раней, падаткі можна плаціць часткамі, — падкрэсліў Андрэй Кавалеўскі. — Вельмі зручна, што наладжана ўзаемадзеянне з АРІП: калі плацельшчык атрымаў паведамленне, напрыклад, на суму 100 рублёў па ўсіх трох падатках, ён сёння можа аплаціць 10 рублёў, літаральна праз хвіліну, зайшоўшы ў АРІП паўторна, ён ужо ўбачыць рэшту запазычанасці».

Калі ў чалавека ёсць якія-небудзь ільготы на выплату падатку на нерухомасць, зямельнага або транспартнага падаткаў, то гэта ўжо будзе адлюстравана ў паведамленні. Самастойна разлічваць нічога не трэба, у падатковую варта звярнуцца, толькі калі вы заўважылі памылку ці няўлічаную ільготу.

Таксама ў самім паведамленні будуць код хуткага плацяжу для ўводу ў сістэму АРІП і QR-код для аплаты. Можна аплаціць падатак па маёмасным нумары, пра які можна будзе даведацца на сайце падатковага органа. Там жа можна і пераафарміць паведамленне, калі яно было згублена.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

КАМУ ПРАДУГЛЕДЖАНЫ ЛЬГОТЫ?

Асобы, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту, інваліды I і II груп, непаўналетнія дзеці вызваленыя ад выплаты падатку ў дачыненні да адной кватэры. Усе астатнія грамадзяне ўносяць аплату падатку нават за адзіную кватэру. Шматдзетныя сем'і цалкам вызваленыя ад аплаты падаткаў, нават калі ў іх уласнасці некалькі жылых памяшканняў. Аднак павінна выконвацца ўмова — у дадзенай сям'і на ўтрыманні і выхаванні павінны знаходзіцца трое і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. Калі старэйшыя ўжо дасягнулі 18-годдзя і ў сям'і засталося менш трох непаўналетніх дзяцей, то дадзеная сям'я для мэт падаткаабкладання не разглядаецца як шматдзетная і льгот не мае.

У гэтым годзе ад падатку на нерухомасць вызваляецца адзін не завершаны будаўніцтвам капітальны будынак, або яго частка, які належыць:

— асобе, якая дасягнула агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту, або асобе, якая мае права на пенсію па ўзросце са зніжэннем агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту;

— інваліду I і II груп;

— непаўналетняму дзіцяці;

— асобе, прызнанай недзеяздольнай;

— ваеннаслужачаму тэрміновай ваеннай службы;

— чалавеку, які праходзіць альтэрнатыўную службу;

— удзельніку Вялікай Айчыннай вайны і іншай асобе, якая мае права на льготнае падаткаабкладанне ў адпаведнасці з Законам «Аб ветэранах».

Пры наяўнасці ў вышэйзгаданых катэгорый фізічных асоб двух і больш не завершаных будаўніцтвам капітальных будынкаў, іх частак, падатковая льгота прадастаўляецца ў дачыненні да аднаго такога аб'екта падаткаабкладання, кошт якога больш, чым кошт іншых такіх аб'ектаў падаткаабкладання, якія належаць плацельшчыку.

«РЭТРААЎТО» І ЭЛЕКТРАКАРЫ

Андрэй Кавалеўскі адзначыў, што гэтым падаткам абкладаюцца транспартныя сродкі, зарэгістраваныя ў органах ДАІ. Выключэнне складаюць выпушчаныя раней 1992 года, а таксама аўтамабілі, якія прыводзяцца ў рух выключна электрарухавіком. Для апошніх ільгота дзейнічае да канца 2025 года.

Стаўка транспартнага падатку зніжаецца на 50 % у дачыненні да машыны, якая зарэгістравана на асоб, якія дасягнулі пенсіённага ўзросту, інвалідамі I і II груп, членамі шматдзетных сем'яў, удзельнікамі баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў. «Але пры адной умове — у такой асобы павінна быць сапраўдным пасведчанне кіроўцы адпаведнай

катэгорыі, — звярнуў увагу Андрэй Кавалеўскі. — Калі пенсіянеру па ўзросце належаць легкавы і грузавы аўтамабілі, але ў яго правы толькі катэгорыі B, то за легкавое аўто стаўка будзе зніжана ў два разы, а за грузавое яна не зменіцца.

ПАВЫШАНУЮ СТАЎКУ ЗА ПРЭМІЯЛЬНЫЯ МАШЫНЫ — ТОЛЬКІ НАЛЕТА

Паводле Падатковага кодэкса, транспартны падатак вылічаецца са ставак, павялічаных у 10 разоў, паводле транспартных сродкаў, з года выпуску якіх прайшло не больш за тры гады, уключаных у пералік аўтамашын павышанай камфортнасці, вызначаны ўрадам, растлумачыў Андрэй Кавалеўскі. У гэтым пераліку — увесь мадэльны шэраг Aston Martin, Aurus, Bentley, Bugatti, Ferrari, Lamborghini, Maserati, McLaren, Porsche, Rolls-Royce, некаторыя мадэлі Audi, BMW, Cadillac, Land Rover, Lexus, Mercedes-Benz, Toyota.

«Гэтая норма ўведзена з 1 студзеня 2024 года. Аднак фізічныя асобы аплачваюць падаткі па завяршэнні года. Адпаведна, гэтая норма закране аплаты падаткаў у 2025-м. Гэта значыць, сёлета ні адна фізічная асоба не аплачвае павышаны транспартны падатак», — сказаў спецыяліст.

Падатковыя органы атрымаюць ва ўстаноўленым парадку звесткі па транспартных сродках павышанай камфортнасці, з года выпуску якіх прайшло не больш за тры гады. «Мы зробім разлікі і будзем разумець, колькі людзей у 2025 годзе будуць аплачваць гэты падатак. Аднак па папярэдніх даных ужо ясна, што колькасць такіх плацельшчыкаў будзе абсалютна нязначный, і аплачваць павышаны падатак яны будуць па сапраўды прэміяльных транспартных сродках», — падкрэсліў прадстаўнік МПЗ.

ТЭРМІНЫ І ШТРАФЫ

Маёмасны плацеж трэба заплаціць не пазней за 15 лістапада. Андрэй Кавалеўскі падкрэсліў, што гаворка ідзе пра аплату за мінулы каляндарны год.

Пені па адзіным маёмасным плацяжы будуць налічвацца на суму, якая ўяўляе сабой розніцу паміж агульнай сумай трох налічаных падаткаў і сумай, аплачанай (спагнанай) у якасці адзінага плацяжу.

Калі па стане на 31 снежня каляндарнага года агульны доўг па адзіным маёмасным плацяжы не перавышае 1 рубель, такі доўг прызнаецца безнадзейным і спісваецца.

Норму аб увядзенні адзінага маёмаснага плацяжу, які аб'ядноўвае тры асноўныя падаткі для грамадзян, увялі ў Падатковы кодэкс сёлета. Хоць раней меркавалася, што гэта новаўвядзенне запрацуе толькі ў 2025-м.

Сяргей КУРКАЧ.

ШКОЛЫ ЧАКАЮЦЬ ВУЧНЯЎ

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама Юрый ЛАРЫЧАЎ запэўніў, што працэс падрыхтоўкі ўстаноў дашкольнай і сярэдняй адукацыі да пачатку новага навучальнага года ажыццяўляецца ў планавым рэжыме.

«Але хачу пачаць з добрых навін: у першы навучальны дзень свае дзверы ў краіну ведаў адчыніць для дзяцей новая сярэдняя школа № 15 на 930 месцаў у Салігорску. А ў вёсцы Копішча прыватным інвестарам, які ажыццяўляе жылую забудову ў Мінскім раёне, пабудавана новая школа на 1120 месцаў. Увесну гэтыя ж спонсары ўвялі ў строй дзіцячы садок. Будаўніцтва важных сацыяльных аб'ектаў у Мінскай вобласці працягнецца. Сёння ў г. п. Смілавічы і Лагойску ўзводзяцца дзіцячыя садкі, за кошт сродкаў Мінгарвыканкама будуюцца дзіцячы садок і школа ў Бараўлянах.

Што датычыцца падрыхтоўкі да новага навучальнага года, то яна вядзецца паводле пастановы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 141 ад 4 сакавіка 2024 года, згодна з якой да 10 красавіка ва ўсіх рай- і гарвыканкамах былі створаны камісіі — іх старшынямі прызначаны намеснікі старшыняў выканкамаў па сацыяльнай сферы. У склад камісій увайшлі прадстаўнікі наглядных органаў — МНС, МУС, санітарных і іншых службаў, якія адказваюць за падрыхтоўку ўстаноў да навучальнага года. Абследаванні аб'ектаў былі праведзены да 20 красавіка; складзены акты, у якія былі ўключаны пункты для абавязковага выканання», — расказаў Юрый Іванавіч.

Ён таксама праінфармаваў аб тым, што камісіі выявілі больш за 1,7 тысячы заўваг і парушэнняў, 90 % з іх ужо ліквідавана. Праз тыдзень камісіі паўторна наведаюць установы адукацыі з праверкай, каб упэўніцца, што заўвагі і парушэнні ліквідаваны і да 20 жніўня ўсе аб'екты атрымалі пашпарты гатоўнасці.

— Такіх аб'ектаў у нас 503, практычна ўсе агульнаадукацыйныя школы. Толькі адна ўстанова адукацыі — Прывольненская СШ Мінскага раёна — пашпарта не атрымае па аб'ектыўных прычынах: там будзе весціся капрамонт да снежня 2024-га. Яе вучняў часова прымуць дзве найбліжэйшыя школы, куды будзе арганізаваны падвоз, — адзначыў Юрый Ларычаў.

Новая школа ў мікрараёне Лебядзіны і дзіцячы садок у Фрунзенскім раёне адкрыюцца ў Мінску да пачатку навучальнага года. Расказвае **намеснік старшыні камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Вольга СМІРНОВА**.

— Новая ўстанова адукацыі можа прыняць 1020 школьнікаў, дзіцячы садок — 190 дашкалят, — прывяла лічбы Вольга Яўгенаўна. — Актыўнымі тэмпамі вядуцца і рамонтныя работы. Прычым закранаюць яны не толькі класныя памяшканні, калідоры, але і спартыўныя стадыёны, харчаблокі і іншыя. Падрыхтоўка да пачатку навучальнага года ідзе ва ўсіх школах і гімназіях. Асаблівая ўвага — стварэнню бяспечных, камфортных умоў. Дзень ведаў — свята для ўсіх: і для дзяцей, і для педагогаў, і для бацькоў. Святочны настрой ствараюць абноўленыя кабінеты, цікавыя зоны рэкрэацыі. Работы працягваюцца ў планавым рэжыме і да належнага тэрміну завершацца. Такім чынам, нашы школы 2 верасня з задавальненнем прымуць больш чым 22 тысячы першакласнікаў, для якіх адкрыюцца 859 класаў, будуць сфарміраваны 512 дзясятых класаў, 62 % з якіх будуць профільнымі.

Вольга Смірнова таксама адзначыла, што большасць профільных класаў маюць прафесійную накіраванасць. Па пяці кірунках установы адукацыі працавалі ўжо ў мінулым годзе. Сёлета іх будзе шэсць: педагагічны, спартыўна-педагагічны, ваенна-патрыятычны, аграрны, інжынерны і новы — медыцынскай накіраванасці.

Алена ВІНАГРАДАВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Павел ЛАЗОВІК:

«ЛЮДЗЕЙ ПРЫЦЯГВАЮЦЬ МАГЧЫМАСЦІ»

Міжнародны спадарожнікавы тэлеканал «Беларусь 24» — сапраўднае люстэрка жыцця нашай краіны, праз якое на яе глядзяць ва ўсім свеце. Сёння вяшчанне вядзецца кругласутачна на рускай і беларускай мовах, а таксама гледачам даступны інфармацыйны кантэнт па-англійску і па-польску ў фармаце бягучага радка. Зона пакрыцця тэлеканала — больш як 100 краін свету з патэнцыяльным ахопам аўдыторыі звыш 200 мільёнаў чалавек. А пачыналася ўсё амаль дваццаць гадоў таму, калі спачатку з'явіўся канал «Беларусь-ТБ», а ў 2013-м яго перайменавалі ў «Беларусь 24», што суправаджалася яго рэбрэндынгам, зменай пазіцыяніравання і жанравага напаўнення. За гэты час адбылося шмат падзей, але нязменнымі застаюцца прынцыпы тэлеканала, дзе аб'ектыўнасць, актуальнасць, дакладнасць і своечасовасць інфармацыі — заўсёды на першым месцы. Цяпер галоўным дырэктарам дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 24» з'яўляецца вядомы тэле- і радыёжурналіст Павел Лазовік. Сустрэліся з ім, каб распытаць пра надзённыя клопаты, зазірнуць у перспектыву і яго асабістыя звышмэты ў прафесіі.

— Павел Вячаслававіч, амаль год вы ўзначальваеце тэлеканал «Беларусь 24». Якія задачы ад пачатку ставілі перад сабой і перад калегамі?

— Па-першае, гэта адбылося ў патрэбны час і ў патрэбным месцы. Калі пра Беларусь сапраўды вельмі шмат гавораць на міжнароднай арэне. Усё гучней і часцей наша краіна заяўляе пра сябе. Таму тут «Беларусь 24», які прасоўвае беларускую павестку за мяжой, як ніколі аказаўся важным, карысным і запатрабаваным. І мне як чалавеку з немалым досведам працы ў журналістыцы, якому кіраўніцтва Белтэлерадыёкампаніі аказала давер узначаліць гэты тэлеканал, было цікава акунуцца ў новы для сябе вопыт. Паспрабаваць тую нішу, якой мы займаліся ўсе гэтыя гады праз інтэрв'ю з дыпламатамі, з замежнымі гасцямі, праз розныя жанры і формы падачы інфармацыі. Мы знайшлі тую нішу і той прадукт, якія дазвалялі нам выйсці на замежную аўдыторыю. Прычым, вывучаючы гісторыю «Беларусь 24» (яму амаль 20 гадоў), я заўважыў, што першапачаткова ён задумваўся як культуралагічны тэлеканал, які будзе знаёміць іншаземцаў з Беларуссю. Напрыклад, хоча чалавек прыехаць да нас і мы яму распавядаем, што ўяўляе сабой наша краіна, якія тут прыродныя багацці і людзі, дзе ён зможа адпачыць. А цяпер наша функцыя ўжо значна пашырылася. Акрамя таго, што ёсць у Беларусі, мы паказваем і яе шлях да такіх вынікаў, адстойваем нашы ідэалагічныя пазіцыі, асабліва ў кантэксце таго, калі некаторыя апаненты спрабуюць скажаць нашу гісторыю, інфармацыю пра тое, што адбываецца на мяжы і навокал нас. Сёння задача «Беларусь 24» паказваць свету праўду, адстойваць нашы нацыянальныя інтарэсы і даводзіць беларускую палітыку, нашу інфармацыйную павестку да міжнароднай аўдыторыі.

— Ці ёсць інфармацыя, якая тэматыка найбольш запатрабавана вашай аўдыторыяй, у прыватнасці замежнымі гледачамі?

— Калі меркаваць па статыстыцы, то ў інтэрнэт-карыстальнікаў (гэта інтэрнэт-версія канала і яго сацыяльныя сеткі) па праглядах лідзіруюць навіны ў краіне і ў свеце плюс праграма перадач, што паглядзець. Таксама сярод лідараў анлайн-трансляцыя англамоўнай версіі тэлеканала. А далей ужо ўсё прадказальна — турызм, таму што наша задача — прэзентаваць Беларусь, прэзідэнцкія навіны і жыццё беларускага грамадства. Людзей за мяжой заўсёды найбольш цікавіць, як мы жывём.

Яшчэ вялікую работу мы сталі праводзіць па даследаванні таго, як і ў якіх краінах ідзе прыём сігналу нашага тэлеканала. Глядач, адкрыўшы раздзел «Медыягід», можа даведацца, калі і на якой платформе ён мае магчымасць убачыць «Беларусь 24». Нагадаю, ён некамерцыйны, бясплатны і не кадзіруецца, што вельмі рэдкая з'ява ў наш час, калі мы гаворым пра спадарожнікавае тэлебачанне. У топ-краін, у якіх нас глядзяць, уваходзяць Расія, Германія, ЗША, Нарвегія, Польшча, Нідэрланды, Нігерыя.

— У наступным годзе тэлеканал «Беларусь 24» будзе святкаваць сваё 20-годдзе. З чым, на ваш погляд, найбольш важным падыходзіце да юбілею? Што ўдалося захаваць, а што, наадварот, хочацца зрабіць па-іншаму?

— Вы слушна адзначаеце пра важнасць захаваць найлепшае, таму што за гэтыя гады ўжо сфарміравалася аблічча канала, яго ўласны стыль, па якім пазнаюць «Беларусь 24». І геаграфія краін у нас вельмі шырокая. Нас глядзяць і ведаюць, пішуць лісты, што дарагога варта. Нядаўна з Расіі быў зварот: маўляў, хачу з дапамогай вашага тэлеканала падзякаваць урачам, якія выратавалі мне жыццё ў беларускім санаторыі. Мы, вядома, перанакіравалі ліст, бо ў нас няма адпаведнай праграмы. Але тое, што водгук ідзе ў асацыяцыі з тэлеканалам, гэта прыемна. Ці пішуць з просьбай уключыць у прагноз надвор'я той альбо іншы горад, бо глядзяць прагноз менавіта на «Беларусь 24». І такіх прыкладаў безліч, бо з гадамі сфарміраваліся ўзаемаадносіны з аўдыторыяй. Гэта натхняе на працу з новымі ідэямі і над новымі праектамі.

Актыўна развіваемся ў інтэрнэце. Удзельнічаючы ў розных галіновых выстаўках, прыйшлі да высновы, што ўсё большая колькасць людзей выкарыстоўвае для атрымання інфармацыі не кабельныя сеткі, не стацыянарны тэлевізар, а менавіта мабільныя прылады (тэлефон, планшэт) і IP-тэлебачанне. Мяркую, за гэтым будучыня. Прычым тады прасцей вызначыць, якая аўдыторыя калі нас глядзіць і ў якой краіне. Маючы лічбы медыявымярэнняў, можна вывучыць запыты гледачоў. Аднак, у «Беларусь 24» яна вельмі разнастайная, бо тэлеканал глядзяць ад Уладзівастока да Зімбабвэ і Лацінскай Амерыкі. Таму для нас так важна нарошчваць цяпер вяшчанне на англійскай мове.

На 2025 юбілейны год у нас ёсць задача зрабіць крок у далёкія гарызонты: запланаваны ўдзел у буйных галіновых выстаўках, будзем працягваць наладжванне супрацоўніцтва з медыяхолдынгамі замежных краін, бо ў нас ёсць што прапанаваць. Напрыклад, нядаўна мы наладзілі абмен кантэнтам з медыякарпарацыяй Кітая. Што дазваляе больш дазнавацца пра іх, пашыраць нашу аўдыторыю. Сёння «Беларусь 24» працуе над мінімум чатырма галоўнымі задачамі: рэтрансляцыя ўсяго найлепшага, што ствараюць Белтэлерадыёкампанія і нашы рэгіянальныя тэлеканалы, з адаптацыяй для міжнароднай аўдыторыі, вытворчасць уласнага кантэнту, прамоўшан нашага тэлеканала і распаўсюджванне яго сігналу ў новыя рэгіёны.

— Павел Вячаслававіч, у структуры Белтэлерадыёкампаніі вы працуеце ўжо больш чым 20 гадоў. Якія перыяды за гэты час былі пераломнымі?

— Кропкі росту заўсёды складаныя, а ўвогуле, лічу, што не бывае простых перыядаў у жыцці. Цяпер такі рытм ва ўсім, што ўсё адбываецца разам з намі, мы пішам сваю гісторыю. І, як ніхто іншы, заўважае гэта чалавек у кадры. Праз нас праходзіць безліч важных падзей. Часам ты проста думаеш, наколькі ўсё скарацечна ў свеце. І разам з тым усведамляеш, як табе пашчасціла быць часткай усяго, што адбываецца, пражываючы гэта ў кадры. Бывае няпроста. І я зараз кажу не пра фізічную стомленасць кшталту прачнуцца а пятай раніцы, каб падрыхтавацца да прамога эфіру. Складана ў тым сэнсе, што ты пастаянна існуеш у паскораным тэмпе і, упісаўшыся ў яго, бяжыш, часам нават на апераджэнне. Такія мы, тэлевізіёншчыкі. Хацець, гарэць, бегчы і быць першымі — гэта ўсё пра нас. Прычым мы так жывём 24/7, без выхадных. Але якое задавальненне адчуваеш ад удала знятых кадраў, патрэбных ракурсаў і прамых эфіраў, калі многае залежыць ад таго, што ты знаходзішся ў патрэбны час у патрэбным месцы! «Час выбраў нас», як казаў неаднойчы Прэзідэнт, і, працуючы на тэлебачанні, мы гэта цудоўна разумеем.

Сёння назіраецца росквіт нацыянальнага тэлебачання (я магу рабіць такую выснову, бо за дваццаць гадоў бачыў рознае). Маладым у нас — дарога. Шмат магчымасцяў, каб рэалізоўваць сябе. А раней трэба было дачакацца сваёй чаргі, каб проста паспрабаваць штосьці сказаць і каб цябе паказалі. У краіне ў нас многа ўсяго адбываецца, мы не сумна жывём. Узяць хоць бы лета: колькі свят, фестываляў, мерапрыемстваў агульнанацыянальнага і міжнароднага масштабу, дзе Беларусь удзельнічае ці арганізоўвае і на годным узроўні ўсё праводзіць. Як не распавядаць пра гэта на тэлебачанні? Нам пашчасціла жыць у такой краіне і ў такім свеце. Мы вось робім праект «Погляд на Беларусь», дзе запісваем многіх іншаземцаў, і мы ж не прымушаем іх з цеплынёй расказваць пра нашу краіну, але ім камфортна ў нас, яны выбіраюць Беларусь сваім другім домам. А мы жывём тут і проста многія рэчы ўспрымаем як належнае і звыклае, думаем, быццам так заўсёды было. Таму асабліва моладзі мы цяпер імкнёмся паказваць, наколькі па-іншаму жылося беларусам раней. Што нічога нам не ўпала з неба. І тады сапраўды на гэта адгукаецца нешта ўнутры ўсіх нас і з'яўляецца разуменне, што толькі працай кожнага на сваім месцы можна дасягнуць агульнага добрага выніку.

— А чаму сёння даводзіцца вучыць моладзь у прафесіі? Ці супадае яе жаданне атрымаць усё і адразу з навыкамі?

— Сёння шмат крэатыўных маладых людзей, якія прыходзяць да нас і кажуць, што жадаюць зрабіць. Яны развіваюцца на практыцы, у кадры. Раней уявіць, што ў чалавека ў 20 гадоў можа быць уласны праект, было проста немагчыма, а цяпер гэта рэальна.

...Але вучыць іх трэба — уменню больш шырока глядзець на ўсё, што адбываецца навокал. Бо здараецца, што чалавек гатовы працаваць з табой у адным тэмпе, а шырыні погляду яму часам не хапае, каб праз канкрэтныя прыклады рабіць высновы пра вялікія праблемы. Калі глабальна казаць пра прэстыж журналістыкі, то ён заўсёды быў і нікуды не знік. І магія тэлебачання па-ранейшаму жывая. Але тым, хто жадае трапіць у кадр, патрэбна разумець, што іх чакае вялікая адказнасць. Прыход на тэлебачанне не павінен быць самамэтай, яго варта ўспрымаць як час магчымасцяў. І ў якім бы статусе (вядучы, рэдактар альбо кіраўнік) ты ні знаходзіўся, заўсёды павінен быць гатовы даказаць, што можаш аднолькава добра працаваць ці нават у разы лепш, чым раней. Я з радасцю працую на любым праекце на тэлебачанні. Сёння мы робім маладое, амбіцыйнае тэлебачанне. Не саромеемся ламаць каноны і спрабаваць новае. І ўсё ж якой бы цудоўнай ні была карцінка, у кадры павінна быць асоба. Гэтаму таксама трэба вучыць маладое пакаленне.

— За што вы ўдзячныя прафесіі сёння і якой бачыце сваю місію ў ёй?

— Я ўдзячны прафесіі, што падаравала мне знаёмствы з многімі людзьмі. Мы вучыліся ў тых журналістаў, якія былі мудрэйшымі за нас, мелі старыя падыходы ў працы і загартоўку. Мне пашчасціла спасцігаць майстэрства ў ветэранаў журналістыкі, калі мы яшчэ без камп'ютараў працавалі і ўсё рабілася ад рукі. Сёння ў нас таксама шмат класных спецыялістаў, за знаёмства з якімі я ўдзячны лёсу. І ў іх вучуся такту, інтэлігентнасці, здольнасці паглыбляцца ў працэс. На тым жа шоу «Фактор.by 60+» няма суфлёра, там патрэбна лёс кожнага героя прапусціць праз сябе. А вынік, які даходзіць да гледачоў, — гэта вялікая камандная работа. Мы даказалі найперш самім сабе, што ўмеем рабіць класныя праекты. Краіна дае шанс тым, хто па-сапраўднаму таленавіты, трапіць на вялікую сцэну. Там няма амбіцый ва ўдзельнікаў, але так шмат асабістага, чым яны жадаюць падзяліцца. Людзі ідуць на праект, каб выканаць песню, прысвяціўшы яе блізкаму чалавеку, ці стрымаць абяцанне, дадзенае самім сабе.

Так і для мяне: быць у прафесіі — гэта мая звышмэта. Я вельмі шчаслівы ад таго, чым займаюся ў жыцці. Лічу, важна быць патрэбным, дарыць радасць людзям. Магчыма, зноў пачну выкладаць. Я ўпэўнены, што журналістыка яшчэ доўга будзе цікавай, і мне хочацца рухацца наперад разам з ёй!

Алена ДРАПКО.

СКАЧКІ З ПАРАШУТАМ І... ПРАПАНОВА РУКІ І СЭРЦА

Чым віцебскія дэсантнікі здзівілі ў сваё прафесійнае свята

Штогод 2 жніўня ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь адзначаюць Дзень дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый. Рыхтавацца да яго дэсантнікі пачалі загадзя. На працягу некалькіх дзён да самой урачыстасці ваеннаслужачыя славутага злучэння ўдзельнічалі ў розных акцыях, ускладалі кветкі да памятных пахаванняў, праводзілі канцэрты, выставы ўзбраення, дарылі кветкі дзяўчатам. Яшчэ больш насычаную праграму яны падрыхтавалі непасрэдна да свята. Карэспандэнт «Звязды» наведаў горад Віцебск — дэсантную сталіцу — і даведаўся, чым сёлета ўразілі блакітныя берэты.

Пераемнікі пакалення пераможцаў

Асноўнае святкаванне адбылося на базе 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай брыгады. Ваеннаслужачыя злучэння зладзілі паветранае шоу з дронамі і вальсавалі з дамамі пад гукі ваеннага аркестра. **Камандзір 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай брыгады гвардыі палкоўнік Уладзімір САФОНАЎ** павіншаваў ваеннаслужачых і ветэранаў злучэння з Днём дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый: «Мы па праве з'яўляемся пераемнікамі паветрана-дэсантных войскаў. І хоць сілы спецыяльных аперацый — досыць малады род войскаў, але вялікія традыцыі, якія закладзены нашымі продкамі, мы памятаем і пастаянна прымнажаем. Улічваючы вопыт вядзення сучасных узброеных канфліктаў, мы выкарыстоўваем усе формы і спосабы вядзення баявых дзеянняў у ходзе баявой падрыхтоўкі».

Ён адзначыў, што нават у прафесійнае свята не ўсе падраздзяленні брыгады знаходзяцца ў пункце пастаяннай дыслакацыі, паколькі працягваюць выконваць задачы па прызначэнні, каб забяспечыць стабільнасць у краіне і яе абарону з улікам існай знешняй абстаноўкі.

Паводле яго слоў, сёння мяняюцца формы і спосабы вядзення войнаў, і гэта ўлічваецца пры правядзенні мерапрыемстваў баявой падрыхтоўкі, але воінскія якасці асабістага складу — адвага, гонар, патрыятызм — застаюцца нязменнымі. «Гэта спадчына, якая дасталася нам ад доблесных продкаў», — падкрэсліў Уладзімір Сафонаў.

Паказальныя выступленні 103-й брыгады сабралі шмат гледачоў. Ад самых маленькіх, якіх бацькі-ваеннаслужачыя паднялі да сябе на плечы, да ветэранаў злучэння, для іх гэтае свята — выдатная нагода зноў сабрацца разам, успомніць гады службы, паказаць унукам, дзе і як яна праходзіла.

Павіншаваў дэсантнікаў і **намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў ДУРНОЎ.** Ён адзначыў, што ваеннаслужачыя 103-й гвардзейскай стралковай дывізіі праславілі сябе на палях баёў Вялікай Айчыннай вайны, а іх пераемнікі праявілі сябе ў Афганістане. Без мінулага — няма будучыні, гісторыю трэба ведаць і памятаць. У тым ліку гісторыю бітваў і войнаў, каб яшчэ мацней берагчы мір. «Паветрана-дэсантныя войскі за час свайго існавання пакрылі сябе неўвядальнай славай. Сёння вы надзейна абараняеце наша мірнае беларускае неба, з'яўляючыся галоўнай, асноўнай баявой адзінкай Узброеных Сіл. Дазвольце пажадаць усім моцнага дэсантнага здароўя, поспехаў у баявой падрыхтоўцы, і, вядома ж, вяртайцеся дадому, дзе вас заўсёды чакаюць родныя і блізкія», — падкрэсліў ён.

Вальс дронаў і «так» ад Ксеніі

У гэты святочны дзень на пляцы брыгады на вачах ва ўсіх **ваеннаслужачы 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай брыгады Уладзіслаў РЫБЧАНКА** папрасіў мікрафон і зрабіў прапанову

рукі і сэрца сваёй дзяўчыне Ксеніі. На квадракоптары яму даставілі бардовы футарал, у якім хаваўся залаты пярсцёнак. Уладзіслаў падняў яго расчуленай каханай разам з букетам чырвоных руж. Яна пагадзілася стаць жонкай дэсантніка, чакаць Уладзіслава з усіх вучэнняў і палявых выхадаў. Малады чалавек таксама павіншаваў усіх прысутных з прафесійным святам.

Загучалі гукі вальса, але танцавалі не толькі пары на пляцы. У паветра манеўрана падняліся дроны, якія таксама выконвалі паветраны танец! Іх рухам дыстанцыйна кіраваў **ваеннаслужачы 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай брыгады, аператар беспілотнага лятальнага апарата Мікіта НУПРЭЙЧЫК.** У будучыні баец плануе стаць афіцэрам і працягнуць службу ў шэрагах славутага злучэння. У гутарцы з журналістамі ён расказаў, чаму навучыўся за час службы: «Родам я з Клецкага раёна Мінскай вобласці. У легендарную 103-ю брыгаду трапіў па прызыве на тэрміновую службу вясной 2022 года. Адслужыўшы паўгода, заключыў кантракт у шэрагах Узброеных Сіл. Мяне вельмі радуе, што ўсе чаканні ад службы апраўдаліся. Кіраваць беспілотнымі лятальнымі апаратамі навучаўся ў Мар'інай Горцы, прайшоў тыднёвыя курсы падрыхтоўкі, атрымаў свой першы дрон і прыступіў да выканання задач. Кіруючы беспілотнікамі, навучыўся выконваць задачы па разведцы на мясцовасці, паражэнні ўмоўнай жывой сілы праціўніка, карэкціроўцы ўдараў ракетных і артылерыйскіх сістэм. Я сапраўды ганаруся тым, што мая служба праходзіць у 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай брыгадзе, якая з'яўляецца найлепшым падраздзяленнем сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Беларусі».

Сіла, хуткасць, адвага, націск!

Авацыі гледачоў выклікалі многія паказальныя нумары. «Сонейка» на турніку ў машыне, якая рухаецца, і выкананне іншых акрабатычных прыёмаў, армейскі рукапашны бой з элементамі з арсенала сусветных відаў адзінаборстваў. Дарэчы, гэтай дысцыпліне ў брыгадзе аддаюць асаблівую ўвагу. Штогод ваеннаслужачыя славутага злучэння займаюць прызавыя месцы па рукапашным баі на чэмпіянатах сіл спецыяльных аперацый і чэмпіянатах краін СНД.

«Да прафесійнага свята рыхтаваліся сур'ёзна, па-дэсантнаму, — адзначыў **начальнік інфармацыйнага цэнтра 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай брыгады гвардыі маёр Эрнэст ЮПАТАЎ.** — Пры гэтым не выключалі і правядзенне заняткаў па баявой падрыхтоўцы і розных вучэнняў. Усе пытанні адпрацоўваліся паралельна. На працягу некалькіх дзён праводзілі трэніроўкі да свята. Упэўнены, што, нягледзячы на невялікую колькасць трэніровак, якія праходзілі ў сціснутым рэжыме, нашы ваеннаслужачыя змаглі паспяхова справіцца з пастаўленымі задачамі».

Эрнэст Юпатаў расказаў, што святочныя мерапрыемствы з году ў год мяняюцца: «Кожным разам мы дадаём нешта новае на аснове нашага найноўшага ўзбраення. Састарэлыя моманты прыбіраем, стараемся зрабіць так, каб людзям, якія прыходзяць да нас з году ў год, заўсёды было цікава. Адметнай асаблівасцю гэтага года стаў вальс беспілотных лятальных апаратаў. У паказальным выступленні таксама ўзялі ўдзел новыя, мадэрнізаваныя ўзоры ўзбраення і ваеннай тэхнікі».

У самых цяжкіх умовах у гады Вялікай Айчыннай вайны і ў сучасных лакальных канфліктах дэсантнікі заўсёды выконвалі складаныя задачы, якія цяжка вырашаюцца для іншых родаў войск, выяўляючы пры гэтым найвышэйшую баявую вывучку, неверагодную сілу духу, бясстрашнасць і адвагу. Не падводзіць і цяперашняе пакаленне дэсантнікаў. Так, канальваючы баявое майстэрства, віцебскія дэсантнікі надзейна абараняюць інтарэсы дзяржавы, забяспечваюць бяспеку і спакой грамадзян. **Ваеннаслужачы 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай брыгады гвардыі малодшы сяржант Аляксей ГРЫНЬ** распавёў, чаму навучыўся за час службы. Сам малады чалавек родам са сталічнага мікрараёна Сокал, больш як паўгода ён праходзіць тэрміновую службу ў шэрагах славутага злучэння. Аднак вярнуўся ў брыгаду адносна нядаўна — на працягу чатырох месяцаў праходзіў курс падрыхтоўкі сяржантаў у 72-м аб'яднаным навучальным цэнтры. «Сёння я камандзір машыны ў новым рэактыўным падраздзяленні. Мы па праве з'яўляемся незаменнай часткай сіл спецыяльных аперацый. У гэты святочны дзень я таксама браў удзел у паказальных выступленнях».

Гвардыі малодшы сяржант Грынь прызнаўся, што па праве ганарыцца службай у шэрагах сіл спецыяльных аперацый: «Сапраўды рады, што трапіў на службу менавіта ў 103-ю брыгаду. Я вельмі хацеў бы, каб усе мае знаёмыя і сябры адправіліся праходзіць службу ў наша праслаўленае злучэнне. Толькі тут яны даведаюцца, што значыць належаць да слаўнага дэсантнага братэрства — правапераемнікаў паветрана-дэсантных войск Савецкага Саюза».

Паводле яго слоў, служба ў праслаўленым злучэнні загартоўвае характар, выхоўвае ў ваеннаслужачых такія якасці, як патрыятызм, мужнасць, адказнасць і пунктуальнасць. «Я стараюся выхоўваць гэтыя важныя якасці ў сваіх падначаленых, разам з імі радуюся агульным поспехам і падтрымліваю пры няўдачах. Нашы байцы заўсёды прыйдуць на дапамогу тым, хто мае ў ёй патрэбу», — падагульніў ён.

У Дзень дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый ваеннаслужачым брыгады былі ўручаны граматы за подпісам міністра абароны Рэспублікі Беларусь і камандуючага сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «ЗападХимСервис»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Кондиционер Tadiran 36, инв. № 3312	624,00	62,40	31,20
2	Кондиционер Tadiran 36, инв. № 3313	624,00	62,40	31,20
3	Кондиционер HSU-24HT203R2, внутренний блок Haier, инв. № 5768; кондиционер HSU-24HUN103R2, внешний блок Haier, инв. № 5769	3 000,00	300,00	150,00
4	Кондиционер AWI-54HPR1C, внутренний блок, инв. № 5786; кондиционер AWO-54HPR1C, наружный блок, инв. № 5787	732,00	73,20	36,60
5	AWI-50HRDC1E внутренний блок, инв. № 29602; AWO-50HRDC1E наружный (внешний) блок, инв. № 29604	1 320,00	132,00	66,00
6	AWI-50HRDC1E внутренний блок, инв. № 29603; AWO-50HRDC1E наружный (внешний) блок, инв. № 29605	1 320,00	132,00	66,00
7	Кондиционер GU140W/A1-M, наружный блок, серия U-Match, инв. № 29807; кондиционер GU140ZD/A1-K, внутренний блок напольно-потолочного типа, серия U-Match, инв. № 29808	4 800,00	480,00	240,00
8	Кондиционер GKH30K3HI, внутренний блок кассетного типа с панелью серия U-Match, инв. № 31774; кондиционер GUHN30NK3HO, наружный блок, серия U-Match, инв. № 31776	3 240,00	324,00	162,00
9	Кондиционер GKH30K3HI, внутренний блок кассетного типа с панелью серия U-Match, инв. № 31775; кондиционер GUHN30NK3HO, наружный блок, серия U-Match, инв. № 31777	3 240,00	324,00	162,00
10	Кондиционер GWH24AAD-K6DNA1A/O, наружный блок серии MUSE(R32), инв. № 31807; кондиционер GWH24AFD-K6DNA1A/I, внутренний блок серии MUSE INVERTOR (R32), инв. № 31808	1 800,00	180,00	90,00
11	Кондиционер GWH24QE-K3DNA1G/O, наружный блок серии LOMO Arctic (R410), инв. № 31932; кондиционер GWH24QE-K3DNC2G/I, внутренний блок серии LOMO Arctic (R410), инв. № 31934	3 240,00	324,00	162,00
12	Кондиционер GWH24QE-K3DNA1G/O, наружный блок серии LOMO Arctic (R410), инв. № 31933; кондиционер GWH24QE-K3DNC2G/I, внутренний блок серии LOMO Arctic (R410), инв. № 31935	3 240,00	324,00	162,00

В отношении лотов проводятся первые торги

Местонахождение лотов: Минская обл., Воложинский р-н, аг. Раков, ул. Радошковичская, 77

Дата и время проведения торгов	**6 сентября 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	С 10.00 6 августа 2024 года до 16.00 4 сентября 2024 года

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «ЗападХимСервис», проводимых 06.09.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 1, 2, 4 – 10 %, по лотам №№ 3, 5–12 – 9 % от конечной цены предмета торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375293042560 (Андрей)**.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Информация о продавце	**ООО «ЗападХимСервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293650697 (Екатерина) (231335, Гродненская область, Ивьевский район, с/с Липнишковский, аг. Липнишки, ул. Виленская, д. 12А, корпус 1, комн. 3, УНП 590191328)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by
Продавец	ОАО «Осиповичи», 225855, Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Осиповичи, ул. Советская, д. 17

Предмет электронных торгов	**Начальная цена, бел. руб. (со снижением 50 %)**
Лот № 1 – жилой дом (здание одноквартирного жилого дома), инв. номер 121/С-17954, общей площадью 70,7 кв. м, по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Антопольский с/с, д. Новосёлки, ул. Новая, 2. Составные части и принадлежности: пристройка, сарай	**5418,68 (без НДС)**
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 122080205201000057: предоставлен на праве аренды по 02.04.2043 г. общей площадью 0,2500 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	
Лот № 2 – жилой дом (здание одноквартирного жилого дома), инв. номер 121/С-17953, общей площадью 70,2 кв. м, по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Антопольский с/с, д. Новосёлки, ул. Новая, 1. Составные части и принадлежности: пристройка, сарай, колодец	**5044,52 (без НДС)**
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 122080205201000056: предоставлен на праве аренды по 02.04.2043 г. общей площадью 0,2500 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	
Лот № 3 – здание коровника (здание специализированное животноводства), инв. номер 121/С-17956, общей площадью 1836,3 кв. м, по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Антопольский с/с, 6, 0,2 км западнее д. Новосёлки	**47 400,00 (с НДС 20 %)**
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 122080200001000374: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,8890 га для строительства и обслуживания здания коровника	
Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов	
Условия оплаты предмета электронных торгов	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8 %** от цены продажи лотов №№ 1–2 и **6 %** от цены продажи лота № 3 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов	
Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.06.2024 г.	
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия	
Дата и время начала и окончания электронных торгов: 27.08.2024 г. с 11.00 до 13.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов	
Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **26.08.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by	
Контактные данные	**Тел.: +375 (17) 373 21 33, +375 (44) 704-92-06. E-mail info@ipmtorgi.by**

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже незавершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 27 августа 2024 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб.	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб.	Сумма задатка, руб.
1	Гродненская область, г. Гродно, ул. Максима Танка, 21 У-296, микрорайон «Заболоть» 440100000002007183	0,1003	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовность 12 %, наружная площадь 127 кв. м. Фундамент: железобетон	353,64	37 845,40 (9 661,10; 28 184,30)	7 500
2	Гродненская область, г. Гродно, ул. Ручеёвая, 43 У-331, микрорайон «Барановичи 5,6» 440100000003004650	0,1016	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение наружная площадь (площадь застройки): 170 (170) кв. м. Степень готовность 11 %. Фундамент: железобетон	358,85	27 781,95 (8 081,71; 19 700,24)	5 500

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского горисполкома от 12.04.2022 г. № 260.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: + 375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести в указанном размере задаток, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится 27 августа 2024 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Прием документов осуществляется по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 7 августа по 21 августа 2024 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Не першы год Сяргей Белаяр даволі паспяхова асвойвае свой літаратурны космас — міжпланетныя прыгоды герояў яго твораў прынеслі брастаўчаніну акрамя чытацкай зацікаўленасці шэраг узнагарод. Пісьменнік уваходзіў у тройку пераможцаў конкурсу апавяданняў «Звязды»; уганараваны літаратурнай прэміяй Брэсцкага аблвыканкама імя Уладзіміра Калесніка, другім месцам у рэспубліканскім конкурсе фантастычнага апавядання.

Гэтым разам Сяргей Белаяр, гісторык паводле адукацыі, запрашае нас не ў далёкія галактыкі, а ў невялікі горад Старадуб Расійскай імперыі, дзе выпадкова затрымаўся дазнаўца Вілча Гаўруш, які расследуе справы, звязаныя з паранармальнымі з'явамі. Нешта падобнае адбылося напярэдадні ў Старадубе — прынамсі, так сцвярджае мясцовы калежскі дарадца. Ці было здарэнне вынікам сувязі з тагасветнымі сіламі або звычайным крыміналам? Ці, магчыма, чымсьці зусім іншым? Гэта Гаўрушу і давядзецца высветліць.

Алена БРАВА.

Сяргей БЕЛАЯР

АГОНЬ МЁРТВЫХ

Фантастычнае апавяданне

Паломка была не ў час — выдавец патрабаваў асабістай прысутнасці для рэдагавання рукапісу. Судовы следчы Вілча Гаўруш хмурыўся, але не дазваляў сабе раздражнення. Любая лютасць — рэч разбуральная. У дазнанні яна згубная ўдвая. Калі ўжо прыйшлося зрабіць прыпынак, лепш заняць чаканне навяжэннем парадку ў думках. Апошні тыдзень у Кіеве выдаўся залішне клапотным.

За спінай тактоўна адкашляліся. Судовы следчы без асаблівага задавальнення павярнуўся.

— Прабачце, што парушаю вашу прыватнасць, спадар Гаўруш, але справа не церпіць адкладу.

— Чым абавязаны, спадар э...

— Апраксін. Ілья Отавіч, — прадстаўнічы мужчына пад пяцьдзясят прыўзняў цыліндр. — Павятовы маршалак дваранства і калежскі дарадца. Прашу прабачэння, аднак Старадубу патрабуецца ваша дапамога.

— Вось нават як? — адлюстраваў ветлівую цікавасць судовы следчы.

— Менавіта так, — калежскаму дарадцу было ніякавата, хоць грунтавая вуліца ў гэты ранішні час пуставала. — Жонка спадара Канавалава, тутэйшага купца, Алена Яўстаф'еўна, ледзь не згарэла жыўцом.

— Прабачце, ваша высокаблагароддзе, але я не доктар. Вы звярнуліся не па адрасе.

— Я ведаю, спадар Гаўруш. Вы дазнаўца. Расследуеце справы, звязаныя з усякай нечысцю, — судовы следчы прымусіў сябе захоўваць куртуазны выраз твару. — Начуты... Запэўніваю вас, без дэманаў тут не абышлося.

— Мой досвед, ваша высокаблагароддзе, сведчыць на карысць таго, што большых дэманаў, чым людзі, няма... З дазволу гасудара-імператара ў сваім цяперашнім статусе я сапраўды займаюся асаблівымі справамі. Дазвольце пацікавіцца, чаму вы вырашылі, што ваш выпадак менавіта такі?

— Спадарыня Канавалава стала ахвярай мерцвяка. Падчас спірытычнага сеансу... Здзіўленыя? Думалі, мабыць, што мы тут капусту лапцем сёрбаем?

— І ў думках не было, ваша высокаблагароддзе.

— Калі б не дапамога сябраў клуба, Алена Яўстаф'еўна згарэла б дашчэнту.

— Дазволю сабе паказаць вашаму высокаблагароддзю, што чалавек ніколі не згарае цалкам, — не трэба было спяшацца з высновамі. — І што, калегі і каляжанкі спадарыні Канавалавай могуць пацвердзіць, што меў месца тэлекінез?

— Што, прабачце?

— Узгаранне на адлегласці.

— Іначай яны не адправілі б па мяне слугу. Клуб спадарыні Канавалавай складаецца з паважаных у Старадубе людзей, зусім не схільных да банмо. Ні алкаголь, ні опіум у клубе не вітаецца, а на галюцынацыі члены клуба не пакутуюць. Гэта вам спадар Крыг, наш гарадскі лекар, пацвердзіць.

— Часам людзей ахоплівае масавы псіхоз. Яны пачынаюць верыць у тое, у што падсвядома жадаюць верыць... — калежскі дарадца толькі развёў рукамі. — У спадарыні Канавалавай ёсць ворагі?

— Гэта значыць, вы бярэцеся за нашу справу? — адчуўшы цікавасць судовага следчага, калежскі дарадца заззяў.

— Не бачу прычын для адмовы, — рамонт рысоры абяцаў адабраць сама меней паўтары гадзіны. Наймаць іншую карэту — не варыянт: ніводная не разлічана на перавозку грузу, без якога дазнанне магло стаць смяротна небяспечным. Для мірных грамадзян перш за ўсё.

— Вашы старанні будуць узнагароджаны, — запэўніў калежскі дарадца. — Старадуб няхай і правінцыя, але гэта правінцыя Расійскай імперыі! Аддзячым, калі спатрэбіцца, за кошт уласных сродкаў.

— Пра гэта пазней, — судовы следчы не меў права пакідаць без увагі ні адной справы, калі яна магла быць звязана з тагасветнымі сіламі. — Вы не адказалі.

— Што вы такое кажаце, спадар Гаўруш?! Якія ворагі? — калежскі дарадца жахнуўся. — Спадарыня Канавалава — найдабрэйшай душы чалавек. Імкнецца ўсім дапамагчы. І словам, і справай. На мінулым тыдні, напрыклад, ахвяравала буйную суму на дзіцячы прытулак.

— Страціла ўласнае дзіця?

Калежскі дарадца спалохаўся. Прасачыць за яго логікай не складала цяжкасці — калі маеш справу з тагасветным, хочаш не хочаш, запэцкаешся. Апраксін нават перахрысціўся.

— Сына. Чатыры з паловай гады ўжо мінула, а боль страты ўсё такі ж моцны. Жадаеце экіпаж?

— Пройдземся, з вашага дазволу, — любое дазнанне неабходна пачынаць са збору інфармацыі. Стаяць над душой у Фрола — усё роўна, што перашкаджаць слузе. Кожны павінен займацца сваёй справай. І менавіта сына выклікала спадарыня Канавалава?

— Так, — адбіваючы рытм кіем, мужчыны пакрочылі ў напрамку цэнтра горада. — Алене Яўстаф'еўне сама спадарыня Блавацкая падрабязныя інструкцыі асабістым лістом даслала. Спадарыня Канавалава з ёй у доўгачасовай перапісцы.

Калежскаму дарадцу відавочна імпанавала тое, што Старадуб — не проста пункт на тапаграфічнай карце Расіі.

— Згаданы вамі клуб збіраецца ў спадарыні Канавалавай?

— У доме купца Райхінштэйна. Па пятніцах.

— Сёння толькі серада.

— Спадарыня Канавалава сказала, што не зможа чакаць так доўга. Яна і час збору прызначыла. Грышку, слугу свайго, пасярод ночы адправіла людзей збіраць. Добра, горад невялікі. Хутка даў рады.

— І вы знаходзіцеся ў вышэйназваным клубе, ваша высокаблагароддзе?

— Маю гонар быць запрошаным, — калежскі дарадца не пакрывіў душой. І відавочна адчуваў крыўду, што не зрабіўся членам клуба ў ліку першых. Noblesse oblige.

— Ці захоўвалася ў пакоі, дзе праходзіў спірытычны сеанс, што-небудзь гаручае? Феерверк?

— Не, спадар Гаўруш. Ні дроў, ні вугалю, ні пораху, ні спірту. Нічога такога. І ніколі з сябраў клуба і ў галаву не прыйшло б прынесці нешта гэтакае. Навошта?.. Не на Масленіцу ж сабраліся. Да мёртвых павага павінна быць.

— Не палічыце за працу, ваша высокаблагароддзе, раскажыце мне пра сяброў клуба.

— Што вы хочаце ведаць? — калежскі дарадца ўвесь напружыўся, вырашыўшы, што судовы следчы запатрабуе нейкай канфідэнцыяльнай інфармацыі. Нават спыніўся, каб утаропіцца поглядам у суразмоўцу.

— Што сабой уяўляюць усе гэтыя людзі, — пытацца ў лоб пра патэнцыяльную сувязь з тагасветным было бессэнсоўна — калежскі дарадца мог элементарна не ведаць пра гэта ці схлусіць. Не праверыш. А вяртацца да карэты азначала абразіць Апраксіна недаверам. Да двубоя дайсці можа.

Аповед калежскага дарадцы атрымаўся кароткім — скончыўся нашмат раней, чым мужчыны падняліся па прыступках. На стук кіем дубовыя дзверы адчыніў дварэцкі.

— Спадарства?

— Мы па справе, Апанас, — сказаў калежскі дарадца, не прадпрымаючы спроб дастаць візітную картку. — Праводзь нас у пакой, дзе ўсё здарылася.

Тлумачэнняў не патрабавалася — дварэцкі паважна кіўнуў і правёў візіцёраў на другі паверх.

— Карл Дармідонтавіч распарадзіўся аказваць следству ўсялякую дапамогу, — растлумачыў калежскі дарадца. — Сам, на жаль, прадстаўлены быць не можа: жонка злягла з нервовым зрывам. Да спадара Крыгі павезлі.

— Пробашч тутэйшага храма...

— Сабора Раства Хрыстова, — падказаў калежскі дарадца. — Пабудаваны ў адна тысяча шэсцьсот семдзесят сёмым годзе... Айцец Цімафей.

— ...айцец Цімафей дзе знаходзіўся ў момант выкліку душы памерлага дзіцяці?

— Злітуйцеся, спадар Гаўруш, — калежскі дарадца збянтэжыўся, — што гэта вы ўсё каверзныя пытанні задаяце?.. Ці не хочаце вы сказаць...

— Не хачу, ваша высокаблагароддзе, але праверыць павінен.

Калежскі дарадца пажаваў вуснамі.

— На службе айцец Цімафей быў. Прыхаджане і царкоўныя служкі пацвердзіць гэта могуць. Не сумнявайцеся.

— Але спірытызму не ўхваляў? — пакой размяшчаўся на другім паверсе, у самым канцы правага крыла дома. Дварэцкі асвятляў дарогу кандэлябрам з шасцю свечкамі.

— Айцец Цімафей шмат чаго не ўхваляе, — у голасе прагучала лёгкае асуджэнне: свет мяняўся, і людзям трэба было мяняцца ўслед за ім. — Аднак на гвалт не пойдзе. Ніколі.

— А яго падначаленыя?

Для спірытычнага сеанса выбралі невялікі квадратны пакой. Цяжкія чорныя гардзіны на абодвух вокнах не прапускалі святла, і для асвятлення запалілі доўгія тоўстыя свечкі. Спірытычны круг — масіўны круглы стол з дубу, ручной работы, — выстаяў, а вось крэслы былі парасквданыя, персідскі дыван малога памеру перад сакрэтнікам — сарваны і апалены. Накрывалі ім.

— За ўсіх не паручуся. Айцец Цімафей адрозніваецца залішняй міласэрнасцю. Можа і змяю на грудзях прыгрэць.

— Скажыце, Апанас, а хто ў клубе спадарыні Канавалавай служыць медыумам? — погляд судовага следчага, пачаўшы з дошкі Уіджа, заслізгаў па спірытычным коле.

— Спадарыня Райхінштэйн-с.

— Месцы ў сяброў клуба сталыя?

— Так, васпане. Спадарыня Райхінштэйн мяркуе-с, што гэта станоўча адбіваецца на зносінах з духамі памерлых-с. Падпарадкаванне іх парадку-с.

— Ці былі пры апошнім сеансе адсутныя? — судовы следчы абышоў стол і падняў скінуты на паркетную падлогу медны кандэлябр. Прамалёўка дэталяў — паядынку Гектара і Ахілеса — уражвала. Вялікіх грошай павінен каштаваць.

— Не, васпане. Спадарыня Райхінштэйн не пачынала сеансу-с, калі патрабаваны парадак парушала хоць бы дробная дэталь-с.

— Тут што-небудзь краналі? — судовы следчы дастаў з кішэні камізэлькі лупу і пачаў пільна разглядаць зламаныя і растаптаныя свечкі.

— Не, васпане. Спадар Райхінштэйн распарадзіўся адразу ж замкнуць пакой-с.

— Пакажыце, дзе хто сядзеў, — наколькі мог судзіць судовы следчы, свечкі былі звычайнымі — без іншародных уключэнняў. Воск і кнот заставаліся некранутымі.

— Як загадаеце-с, васпане, — дварэцкі рушыў па крузе. Спыняючыся каля кожнага месца, ён клаў рукі на стол і называў прозвішчы. Ні чын, ні паходжанне, ні багацце не ігралі ў рассаджванні аніякай ролі.

Судовы следчы падзякаваў дварэцкаму і падняў крэсла, на якім сядзела Канавалава. Затым прыставіў яго да стала і паставіў на стальніцу кандэлябр.

— Ці не занадта шмат свечак, Апанас? — спірытычны сеанс патрабаваў цемры. Напаўцемры, але ніяк не святла сонечнага дня. Для нядобрасумленных медыумаў цемра служыла асноўным саюзнікам у падмане кліентаў.

— Я іх у такой колькасці толькі перад пачаткам і пасля канца сеанса запальваю-с, васпане. Гэтыя не гасіў-с. Спадарам Райхінштэйнам не загадана было-с. Каб сляды не чапаць-с.

— Кандэлябр дзе стаяў дакладна?

— Няўжо гэта мае нейкае значэнне? — выказаў здзіўленне калежскі дарадца. Апраксін, які чакаў дзеяння, быў расчараваны.

— У маёй справе дэталі выключна важныя, ваша высокаблагароддзе.

— Тут-с, — дварэцкі ўстанавіў кандэлябр. — Заўсёды ў адным і тым жа месцы-с.

— На спадарыні Канавалавай у гэтую ноч была сукенка з крыналінам?

Калежскі дарадца, які перастаў штосьці разумець, адкрыў і закрыў рот.

— Цалкам дакладна-с, васпане, — дварэцкі кіўнуў. — Нябесна-блакітная-с.

— Што ж, мне ўсё зразумела, — на судовым следчым спыніліся запытальныя погляды. Гаўруш прыбраў лупу і растлумачыў: — Ні мерцвякі, ні нячысцікі, ні людзі не маюць да сумнага здарэння ніякага дачынення. Гэта быў няшчасны выпадак: спадарыня Канавалава мела неасцярожнасць закрануць краем сукенкі полымя свечкі. Яшчэ адна ахвяра моды. Сукенка спадарыні Канавалавай, вядома, не ідзе ні ў якое параўнанне з вар'яцкімі купалападобнымі прызборанымі спадніцамі англічанак, якія тыя насілі яшчэ трыццаць гадоў таму, але бясшкоднейшай ад гэтага яна не становіцца: сам матэрыял вогненебяспечны, а абручы ствараюць паветраныя кішэні.

— І ўсё гэта вы вызначылі па лапіку сукенкі, спадар Гаўруш? — захапленне суседнічала ў калежскім дарадцы з забабонным страхам. Судовы следчы не здзівіўся б, калі б даведаўся, што Апраксін прымае яго за д'ябла ў цялесным вобразе. Людзі ўвогуле схільныя гіпербалізаваць уласныя страхі. Можа, таму, што тады спалох не падаецца такім ганебным?

— Не толькі. Характарыстыка сябраў клуба, пачутая ад вас, ваша высокаблагароддзе, таксама аказалася карыснай... Версію ўмяшання тагасветных сіл я выключыў адразу — у падобных выпадках усё здараецца інакш. Забойцы не магло быць сярод прысутных: сябры клуба першымі трапляюць пад падазрэнне. І пры іх статусе не стануць пэцкаць уласныя рукі. Ёсць мноства іншых, больш дзейсных спосабаў расправы... Як вы можаце бачыць, у пакоі няма вогненебяспечных рэчываў. А методыка зносін з душамі памерлых, якую прапануе спадарыня Блавацкая, не працуе. Плюс крэслы — для зручнасці карыстання імі дамамі ў сукенках, «расцягнутых на крыналіне», у іх зрэзаны падлакотнікі.

— Брава, спадар Гаўруш! — калежскі дарадца запляскаў у ладкі.

— Спадарыні Канавалавай яшчэ пашанцавала, што побач з ёй былі людзі. Клетка, якой, па сутнасці, з'яўляюцца спадніцы на цяжкім каркасе, на жаль, можа стаць смяротнай пасткай.

Фестывалім

ПАД ЗВОН МСЦІСЛАЎСКІХ МЯЧОЎ

Старажытны горад традыцыйна парадаваў уражаннямі

У Сярэднявеччы Мсціслаў фактычна быў усходнім фарпостам ВКЛ, тут стаяў замак, і нярэдка адбываліся баі і аблогі. Сёння гэта квітнеючы горад, дзе захавалася шмат прыкмет слаўнай даўніны. І, напэўна, адзін з нямногіх, дзе плошчу каля райвыканкама ўпрыгожвае помнік не Леніну, а першадрукару Пятру Мсціслаўцу — славутаму земляку. Адсюль традыцыйна і пачынаецца прыгожае свята. Сёлета яно праходзіла ў 16 раз.

На фестываль прыязджае шмат дэлегацый і гледачоў. Па традыцыі яго наведваюць прадстаўнікі расійскіх раёнаў, з якімі мяжуе Мсціслаўшчына. З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў і гасцей свята звярнуліся **старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Дзмітрый ПІМАШЭНКА** і **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Алег СТЭЛЬМАШОК.** Прагучаў прывітальны адрас ад **старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля ІСАЧАНКІ.** У азнаменаванне адкрыцця турніраў па старажытнай традыцыі камандор Ордэна Паўночнага Храма — месір Гілмар дэ Во перасек канат і запрасіў амаль на цэлыя суткі ў падарожжа па мінулых стагоддзях.

Гэты фестываль асаблівы, мала дзе жыхары пераўтвараюцца ў дзейных асоб: апранаюць сярэднявечнае адзенне, гатуюць прысмакі па старадаўніх рэцэптах, вучаць гасцей старажытным танцам, уцягваюць іх у розныя гульні і квэсты. Сёлета шмат хто стаў удзельнікам конкурсу «Касцюм эпохі» і тэатралізаванага шэсця. Прадстаўнікі працоўных калектываў апрануліся ў касцюмы ў адпаведнасці са сваёй дзейнасцю або прафесіяй у эпоху Сярэднявечча. Узначалілі відовішчную калону фанфарысты, за імі чынна прайшлі разам з заснавальнікам Мсціслава — князем Расціславам яго сямейнікі і світа. Следам прысутных вітаў першадрукар Пётр Мсціславец, спевакі і музыкі, рамеснікі і кавалі ды іншыя ўдзельнікі ў вобразах персанажаў сярэднявечнай міфалогіі, гараджан і гандляроў з простанароддзя. Упершыню на свята завіталі госці з Чавускага раёна — удзельнікі этнасвята «У госці да радзімічаў». Гэта яшчэ адна фішка сёлетняга фэсту, якая сімвалізуе сувязь дзвюх эпох як прыкмету адной гісторыі, адзінства і сяброўства.

Здзіўляла, наколькі арганічна людзі адчуваюць сябе ў ролі далёкіх продкаў.

Па дарозе да Замкавай гары сустрэўся каларытны дворнік з раённага жылкамгаса. Прадпрыемства забяспечыла яго фартухом з грубай тканіны і мятлой. А ён да фэсту пафарбаваў сівыя валасы ў руды колер. Як той казаў, чаго не зробіш дзеля іміджу калектыву. Уразіла колькасць майстроў і рамеснікаў. На Мсціслаўскі фэст іх зарэгістравалася 180 чалавек, а прысутнічала, напэўна, яшчэ больш. Кажуць, што на фэст «Вясновы букет» у Мінск з'язджаюцца каля 300. Дык маштабы гарадоў не параўнаць. Значыць, людзям цікава мсціслаўскае свята.

«Таблетка» ў кашулі

Немагчыма рыцарскае свята ўявіць без рэлігійнага складніка. На адкрыцці з пажаданнямі і благаславеннем заўсёды выступае свяшчэннік. Дзверы мсціслаўскіх храмаў у гэты дзень гасцінна расчынены для наведвальнікаў. У царкве ў гонар прападобнага Сілуана Афонскага, якая знаходзіцца на вуліцы Савецкай якраз па дарозе ад плошчы Пятра Мсціслаўца да Замкавай гары, размешчаны ўнікальны народны музей ікон і іншых царкоўных прадметаў. Айцец Ігар расказвае, што ў свой час звярнуўся да людзей з прапановай перадаць храму царкоўныя рэчы, каб захаваць для нашчадкаў. Так з'явіўся цікавы музей, у якім можна прасачыць усю гісторыю стварэння ікон, у тым ліку на тэрыторыі Мсціслаўшчыны.

— Гэта наша спадчына. Ікона перакладаецца на нашу мову як абраз. Мы павінны шанаваць абразы Бога, Маці Божай, святых, — кажа свяшчэннік.

Айцец Андрэй прыехаў у госці да айца Ігара са Смаленска, служыць у Рослаўскай епархіі. Ён вывучаў іканапіс і прапануе правесці экскурсію. Звяртае ўвагу на тое, што ў музеі шмат абразоў басценавіцкага пісьма. Гэта населены пункт Мсціслаўскага раёна. Да рэвалюцыі там была яшчэ і школа па стварэнні ікон. Бацюшка пасвячае ў нюансы, расказвае, што такое абраз-таблетка, навошта іконам патрэбна кашуля — аклад.

— Іконы прыйшлі ў Расію, а потым і да нас у Беларусь, — расказвае айцец Андрэй. — Басценавіцкія, на жаль, з-за вільгаці і сырасці асыпаюцца. Так адбываецца, калі іканапісцы эксперыментуюць з фарбамі і парушаюць тэхналогію. Для нашых продкаў ікона была самым каштоўным у іх жыцці. І калі здараліся войны, яны забіралі з дому самае дарагое — абразы. Заказаць сабе пісаную ікону мог толькі заможны чалавек, за яе можна было аддаць цэлую карову. Зараз наогул амаль ніхто сабе іконы не заказвае. Набываюць гатовыя.

А яшчэ суразмоўнік расказаў, як адрозніваць уніяцкія іконы ад праваслаўных. На іх замест німбаў над галовамі святых свячэнне. Іконы савецкага перыяду выключна саматужнага паходжання. Знайшлі фота, абклалі яго фольгай — вось і ўсё.

Печка на Замкавай гары

У старажытным Мсціславе ведалі, як зрабіць госця задаволеным. Адно з нязменных правілаў — смачна накарміць. Наесціся на свяце можна было і без грошай. У фудкортаўскіх харчэўнях цэны кусаліся. Ратавала тое, што мсціслаўцы — вельмі гасцінны народ. Калі мала грошай, накормяць бясплатна. На Замкавай гары ў ролі гасцінных гаспадароў і гаспадынь выступілі прадстаўнікі розных сельсаветаў. Сапрынавіцкі сельсавет частаваў смачнымі блінамі, рыбкай, якая толькі што плавала ў Віхры, іншай хатняй ежай. Гаспадыня Агата (Алена Несцярэнка з Краснагорскага сельсавета) і гаспадар Сцяпан (Аляксандр Шалабода з Капачоўскага сельсавета) прапаноўвалі падсілкавацца хатняй каўбасой, свіной галёнкай, кумпякамі.

Апошнія пяць гадоў нязменным попытам у наведвальнікаў свята карыстаецца харчэўня на Замкавай гары, якую абслугоўваюць работнікі Ходасаўскага сельскага Дома культуры.

— Робім дранікі, бабку ў печы, уся выпечка дамашняя, — хваляцца дзяўчаты. — Нешта ноччу гатуем, прывозім з сабой: у сем гадзін распальваем печку і вось у такой дружалюбнай атмасферы працуем да гадзіны ночы — 20 найменняў страў, напоі салодкія і не вельмі. Мы можам усё, працуем па жаданнях. Рыцары ў асноўным сваё прывозяць, а гледачы перыядычна падыходзяць да нас па гарачыя дранікі або бліны. Нашы мужчыны робяць шашлыкі, жанчыны шчыруюць каля печы. Усё з полымя, з жару. Глядзіце, якая смачная бабка, са смятанай проста песня!

Колькі каштуе пярсцёнак для паненкі?

Пакуль у цэнтры Замкавай гары ідуць баі, па перыметры кіпіць шараговае сярэднявечнае жыццё — дамы прыбіраюцца ў паходных палатках, рыцары рыхтуюцца да баёў, тут жа ідзе гандаль сярэднявечнымі рэчамі, сярод якіх шмат жаночых упрыгожанняў. Чую, як дзяўчына цікавіцца коштам пярсцёнка і фібулы. Прадавец агучвае цану — 100 рублёў, і прыгажуня кладзе яму на далонь купюру, нават не таргуючыся: «Бяру ўсё».

— Напэўна, цана мінімальная, — не магу не пацікавіцца.

Прыгажуня паціскае плячыма і кажа:

— Мне вельмі падабаюцца пярсцёнкі. Тут танней, чым на заказ у майстроў. Латунны гузік, напрыклад, каштуе два долары. Тут матэрыялу пайшло болей, плюс форма, якую нарыхтаваць трэба, і работа. Мяркую, што сабекошт загатоўкі для пярсцёнка будзе рублёў 20. Да таго ж ён падобны на тыя, што насілі ў XV стагоддзі.

Дзяўчына прадстаўляе клуб «Залатая шпора». Плаўна пераходзім ад упрыгожанняў да гістарычных строяў. «Самі ўсё пашылі. Можна заказваць у майстроў, але гэта велізарныя грошы», — кажа дзяўчына.

Да размовы далучаюцца сябры па клубе. Малады чалавек адзначае, што ў Сярэднявеччы не толькі дзяўчаты, але і хлопцы любілі прыбірацца.

— Пра ландскнехтаў нешта чулі? — пытаецца ён. — Яны апраналіся вычварна, павінны ж былі быць нейкія радасці ў жыцці. Яны часта ваявалі і аднойчы маглі не вярнуцца. Упрыгожанні — гэта як кампенсацыя за кароткае жыццё.

— Хобі наша не таннае, яно патрабуе часу, — уступае ў размову Ганна. — Я, напрыклад, займаюся XVII і XIX стагоддзямі і амаль кожныя выхадныя з мая па верасень езджу з сябрамі па фестывалях па Беларусі, бывае, выязджаем у Расію. Напрыклад, на фэст у Барадзіно. У XIX стагоддзі я маркітантка, гандлярка пры французскай гвардыі Напалеона. Гэта элітная пяхота. Адзенне сабе шыю сама. А вось абутак, нейкія дэталі адзення купляю. Добры абутак каштуе 70—100 долараў. Панчохі купіла на Wildberries за 10 рублёў. На мне штаны-буксоры, у сябра кафтан — жустакор. У мяне ёсць такі ж, але зняла, бо горача на вуліцы. Калі шыць афіцэрскі камплект на заказ, будзе каштаваць ад 150 долараў да 300. Мой касцюм абыдзецца танней, думаю, долараў у 70. Кашуля з лёну або бавоўны — гэта яшчэ рублёў 20—30, шаўковыя будуць даражэй. Капялюш з валенай воўны абыдзецца ў 30—40 долараў. Ножны — 50 долараў, шпага каштуе 250...

Дарэчы, Ганна добра валодае ёй і ўдзельнічае ў баях з мужчынамі нараўне.

Навошта гэта трэба

Помнік археалогіі Замкавая гара з'яўляецца цэнтрам фестывалю. Да позняй ночы тут ідуць баі на дзідах і мячах, лучныя турніры, бугурты, штурм і спальванне замка, трукавае шоу ад клуба «Шатландская пяхота», конныя тэатралізаваныя паказы і забавы ад коннага гістарычнага клуба «Залатая шпора». Баі змяняюцца выступленнямі музычных, харэаграфічных, тэатральных калектываў.

Свята праходзіла пад гукі старажытных музычных інструментаў фолк-гурта «Хмяльны вір», сваіх прыхільнікаў парадавалі музычныя гурты «Без Панікі» і «Дудараў». Моцныя эмоцыі падарылі відовішчныя фаершоу ад калектываў «Крэсіва» і «Кетры» з Мінска, «Атама» з Віцебска, «Маоры» з Магілёва. Гулянні на Замкавай гары працягваліся да чатырох гадзін раніцы.

Паглядзець на рыцарскія баі прыязджаюць і беларусы, і расіяне. Гэта не толькі стук мячоў, але і сапраўднае шоу дзякуючы вядучым. Слухаць іх рыторыку — яшчэ тая забаўка. Такія шпількі часам адпускаюць... Але без іх каментараў паядынкі былі б прэсныя.

— Навошта людзям патрэбныя гэтыя сярэднявечныя баі і турніры? — разважаў адзін з іх, пакуль на рысталішчы чарговыя чацвёркі рыхтаваліся да бою, і трэба было запоўніць паўзу. — Я задаваўся гэтым пытаннем, пытаўся ў іншых: чаму вы ідзяце на гістарычную рэканструкцыю, чаго вам не хапае? Адказы былі розныя, але мне падалося, што людзі ідуць сюды па пераадольванне свайго ўласнага страху. Таму што ўсё жыццё — так сведчыць гісторыя — мужчына змагаўся. Зараз мы доўгі час знаходзімся ў разняволеным стане. Ад гэтага мужчыны хварэюць і паміраюць раней. Асноўная функцыя, якая ў нас закладзена, забытая, і пераход вось у такі від спорту дае магчымасць падоўжыць сваё жыццё, маладосць. Цела баліць, але душа адпачывае.

Майстар-клас ад каваля

На свяце майстар-класаў было шмат. Вучылі прыгатаванню ежы, танцам, гульням і нават кавальскім прыёмам. Упершыню на Замкавай гары была арганізавана работа інтэрактыўнай пляцоўкі «Замак каваля», дзе сваё майстэрства дэманстравалі лепшыя майстры Магілёўскай вобласці.

— Фестываль 16-ы, я бяру ў ім удзел 15-ы раз, — кажа **знакаміты мсціславец, народны майстар па кавальскім кірунку, прадстаўнік мясцовага Дома рамёстваў Сяргей КУДЗІКАЎ,** які сабраў на фэст кавалёў з усёй вобласці. — На жаль, па стане здароўя ў якасці рыцара сёлета не выступаю, але душой і сэрцам з імі. Мяне гэты фэст натхніў на кавальскае рамяство. На другім свяце па ліку я ўжо быў у кальчузе, прадстаўляў клуб «Мсціслаўская харугва». Калі ў Мсціславе праходзіць рыцарскі фэст, сюды з'язджаецца моладзь з усіх канцоў краіны, пануе сяброўская атмасфера. Мы ж не ваюем адзін з адным, мы паказваем людзям мастацтва валодання мячамі, дзідамі, уменне весці баі на конях. Кавальская прафесія ў Сярэднявеччы была самая запатрабаваная. І мне падалося, што гэта трэба было адзначыць. Таму мы і выдзеліліся сёлета сярод астатніх. Прыехалі майстры са Шклова, Магілёва. Пераемнасць пакаленняў вельмі важная, у мяне таксама ёсць чаляднік, Кірыл Дундукоў вучыцца ў Мсціслаўскай гімназіі. Збіраюся ў будучым сабраць яшчэ больш майстроў і стварыць гільдыю кавалёў Магілёўскай вобласці.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.
г. Мсціслаў.

Не прапусціце!

ШЭДЭЎРЫ ПРЫЯЗДЖАЮЦЬ ДА ВАС

Першы перасоўны выставачны праект «Беларускі народны: код нацыянальнай якасці. Шэдэўры народных мастакоў са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь» прадставілі ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі.

Гэта звыш 40 твораў жывапісу, графікі, скульптуры аўтарства мастакоў, творчасць якіх — прызнаны залаты фонд выяўленчага мастацтва краіны. Перасоўны выставачны праект Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі экспануе работы творцаў, якія маюць ганаровае званне «Народны мастак БССР» і «Народны мастак Беларусі». Сярод іх — Заір Азгур, Іван Ахрэмчык, Вітольд Бялыніцкі-Біруля, Гаўрыіл Вашчанка, Валянцін Волкаў, Віктар Грамыка, Май Данцыг, Яўген Зайцаў, Аляксандр Кішчанка, Раіса Кудрэвіч, Павел Масленікаў, Іван Міско, Георгій Паплаўскі, Міхаіл Савіцкі, Віталь Цвірка і іншыя.

Прэм'ерная прэзентацыя праекта ўжо адбылася ў Мастацкім музеі імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі ў культурнай сталіцы 2024 года — Бялынічах. Выстаўка таксама была прадстаўлена ў філіяле «Мастацкі музей» Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.

Як адзначыла на прэзентацыі выстаўкі ў Гомелі **генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Ганна КОНАНАВА,** абласны цэнтр з асаблівым натхненнем прыняў гэты праект.

— Ён увабраў у сабе некалькі канцэптуальных, вельмі магутных кірункаў. Перш за ўсё — гэта прысвячэнне Году якасці ў Рэспубліцы Беларусь. Якасць нам бачыцца як эквівалент у творах народных мастакоў, якія прадстаўляюць сваёй творчасцю залаты фонд краіны. Для нашых гледачоў у гэтым праекце — увесь цвет нацыянальнай беларускай спадчыны ў галіне жывапісу, графікі, скульптуры. Варта адзначыць, што ў праекце прадстаўлены шэдэўры першага раду. Яшчэ адна адметная асаблівасць праекта — тое, што ён перасоўны. Для Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі гэта не з'яўляецца правілам, што яшчэ раз падкрэслівае: у 2024 годзе жыхары ўсіх абласных гарадоў нашай краіны змогуць ацаніць шэдэўры, не ехаць у Мінск для таго, каб пабачыць іх на пастаянных экспазіцыях, часовых выстаўках з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, а пазнаёміцца на месцах. Гэта такі цудоўны падарунак не толькі для жыхароў абласнога горада, але і рэгіёна, — звярнула ўвагу Ганна Конанава.

Так, у Год якасці па-за межамі галоўнай арт-пляцоўкі краіны творы, якія па праве лічацца класікай і эталонам беларускага выяўленчага мастацтва XX — пачатку XXI стагоддзя, будуць прадстаўлены ва ўсіх абласных цэнтрах. Да канца года праект змогуць ацаніць жыхары Віцебска, Гродна, Магілёва.

Акрамя таго, маштабны перасоўны праект — знакавы ў год святкавання 85-гадовага юбілею Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Выстаўка, прысвечаная народным мастакам Беларусі, сярод якіх ёсць удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, — таксама важны падарунак беларусам з нагоды 80-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Як адзначыла на прэзентацыі выстаўкі **загадчыца мастацкага аддзела Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Таццяна ЛІТВІНАВА**, гэты выставачны праект сапраўды знакавы для культурнага жыцця Гомельшчыны. Яна ж, Таццяна Літвінава, нагадала, што Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь і Гомельскі палацава-паркавы ансамбль звязвае плённае шматгадовае супрацоўніцтва. Першы сумесны праект Мінска і Гомеля экспанаваўся, калі яшчэ працягвалася рэстаўрацыя ансамбля, у 1999 годзе.

Між тым куратарамі выставачнага праекта выступаюць супрацоўнікі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь — загадчыца аддзела беларускага мастацтва XX—XXI стагоддзяў Святлана Кот і старшы навуковы супрацоўнік аддзела беларускага мастацтва XX—XXI стагоддзяў Анастасія Карнейка.

У Гомелі экспанаванне працягнецца да 29 верасня ўключна.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

ФРАГМЕНТЫ ЛУЧНАСЦІ,

альбо Традыцыйныя посцілкі як крыніца натхнення для сучасных мастакоў

...Ой, нібыта ў дзяцінства вярнулася і да бабулі прыехала!.. Колькі дзесяцігоддзяў прайшло, як няма яе на гэтым свеце, а цяпло колішніх сустрэч у вясковай хаце захоўваецца вельмі глыбока. Вось варта было толькі адчыніць дзверы, што вядуць у мастацкую галерэю «Цэнтр» Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, як у вачах зайгралі ўзоры і колеры, што бачыла даўным-даўно на тканых рэчах, якімі засцілалі ложкі ды канапы. Здавалася, такога ўжо нідзе няма... Дык і няма: сучасныя людзі карыстаюцца рэчамі, выпушчанымі прамысловасцю ў розных варыянтах тканін і больш таннымі. А тыя рэчы з колішняга жыцця былі дарагія, прычым не толькі сэрцу, але і ў матэрыяльным сэнсе, таму што зробленыя рукамі. Гэтыя вясковыя тканыя рарытэты можна пабачыць на выстаўцы «Посцілкі+», але не толькі іх: тут прыклад таго, як традыцыйнае рамяство і народнае мастацтва натхняюць сучасных творцаў — прафесійных мастакоў. Бо ўсе мы маем пэўнае паходжанне, і прырода чалавечага таленту абумоўлена безліччу акалічнасцяў і сувязяў, асабістых якасцяў, якія закладваюцца ў тым ліку і асяроддзем.

Дзіва ў тым, што колішнія посцілкі (і ўзоры на іх) з'яўляюцца крыніцай натхнення для зусім маладых людзей, якія, аказваецца, з дзяцінства памятаюць тое ж, што і я... Беларускі свет у дзеянні — мы знітаваныя адной традыцыяй і разуменнем таго, што ёсць цеплыня дома, цеплыня чалавечых рук і душы. І што важна — як калісьці, так і цяпер. Прычым, як паказвае выстаўка, гэта каштоўнасць уласціва розным відам мастацтва: жывапісу, тэкстылю, ювелірнаму майстэрству...

Цяпло, напрыклад, вылучае тонкая сучасная работа, на якой вытканы вобраз жанчыны на жніве, — работа мастачкі па тэкстылі Наталлі Філіпенка. Але ёсць у ёй адсылка да нейкай сакральнай часткі беларускай рэчаіснасці. Гэта праца невялікая ў параўнанні з посцілкамі, якія развешаны па сценах, раскладзены на падстаўках, ды нават змешчаны на паліцах пад шклом — так ставяцца да сапраўдных музейных рэліквій, якія трэба пільна захоўваць. А за тое, што яны прыехалі на выстаўку, прымеркаваную да 85-годдзя Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, — вялікі дзякуй арганізатарам. Таму што гэта найлепшы шлях, каб паказаць лучнасць мінулага і сучаснасці. На выстаўцы ў не надта вялікай прасторы галерэі ўмудрыліся размясціць аж 46 посцілак. З іх толькі дзевяць вытканыя нашымі сучасніцамі ў апошнія некалькі гадоў. Уявіце, ёсць майстрыхі, якія займаюцца гэтым сёння, каб захоўвалася рамяство і працягвала жыць традыцыя. Напрыклад, народны майстра Рэспублікі Беларусь Таццяна Волкава — яе аўтарскія работы можна ўбачыць і параўнаць з колішнімі, тым больш, што ёсць аўтарская рэпліка на адну з даўніх посцілак, якая захавалася не вельмі добра. Але большасць экспанатаў у зале — сапраўдныя рарытэты (да іх цяпер адносяць посцілкі 50—70-х гадоў мінулага стагоддзя). Аснову выстаўкі склалі посцілкі з калекцыі Вілейскага краязнаўчага музея, раённага Цэнтра ткацтва з Семежава, фондаў народнага калектыву «Майстры Ігуменшчыны» Чэрвеньскага раённага цэнтра культуры і адпачынку. Успрыманне гледача ўзмацняюць старыя фотаздымкі вяскоўцаў на фоне посцілак. Калісьці іх прымянялі не толькі ва ўтылітарных мэтах, але і дзеля ўпрыгожвання хаты. А калі на вёску прыйшло фота, то яскравыя посцілкі вешалі на сцяну, ля якой размяшчалася сям'я дзеля фотасесіі — яскравы фон рабіў кожны здымак адметным яшчэ і таму, што такія рэчы не выпускала масавая вытворчасць, гэта фактычна быў эксклюзіў.

Цяпер яго ствараюць мастакі. Напрыклад, Міла Землякова стварае тэкстыльныя скульптуры ў аўтарскай тэхніцы — яе цудоўны заяц Васіль нібыта прысеў адпачыць на фоне іншых прыкладаў работ мастачкі, што прадстаўлены на фота, і сярод вялікіх посцілак, размешчаных побач. Тут заўважаеш работы меншыя па памеры — жывапіс. Аўтар палотнаў Андрэй Карпянкоў не ствараў іх адмыслова пад выстаўку, творы былі напісаныя некалькі гадоў таму, калі пра такі праект ніхто і не думаў. Проста і ён бываў у бабулі на вёсцы, і ён бачыў рэчы, якімі напаўнялася хата. І яго свядомасць злучыла іх з мастацтвам — нібыта ўпляла ніткі памяці ў сучасныя творы (нездарма адна з яго серый мае назву «Тканіна жыцця»). Недзе мазкі фарбы імітуюць палатно, недзе праступаюць фрагменты арнаментаў, недзе яны быццам бы ўгадваюцца ў краявідах.

Нават фрагменты з тканых палотнаў — быццам бы вызначальныя элементы. Глядзіш на асобны фрагмент (нават не на тканіне), і прыходзяць думкі: штосьці надта блізкае, знаёмае... Наталля Філіпенка разам з мужам Яўгенам Рыжовым, які з'яўляецца мастаком па метале, прадставілі арыгінальныя вырабы з латуні, асновай для якіх сталі фрагменты некаторых узораў посцілак. Ну, сапраўды, чым не эксклюзіўныя брошкі — прычапіў такую на сукенку, і адчуваецца: свой чалавек! Мастакі шчыра тлумачаць: усе яны мелі бабуль і захоўваюць памяць пра вясковае жыццё, да якога даводзілася далучацца няхай і на канікулах ці ў адпачынку. Можна казаць, што кожны з удзельнікаў выстаўкі нашых сучаснікаў дапамог не толькі стварыць частку экспазіцыі, каб яна была больш разнастайнай, але праз творы зрабіў адмысловае прысвячэнне свайму роду. Таму вельмі сімвалічна і кранальна выглядала фотасесія сям'і Філіпенка-Рыжовых з двума дзеткамі — нават не побач са стыльнымі бацькоўскімі работамі, а на фоне яркіх посцілак. Дарэчы, арганізатары выстаўкі «Посцілкі+» у сталічнай мастацкай галерэі «Цэнтр» абвясцілі фотаконкурс, у якім можа ўзяць удзел кожны наведвальнік: прыйшоў, натхніўся і сфатаграфаваўся з упадабанымі экспанатамі ці на іх фоне. Як калісьці...

Ларыса ЦІМОШЫК.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГРАН»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
